ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 КАСТРЫЧНІКА 2016 г. ЧАЦВЕР № 193 (28303)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА




«Мару стаць сапраўдным артыстам»



Як я была клінерам



Каб абранніца сказала «так»...

ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:**

*«Трэба неадкладна займацца пытаннямі ўрэгулявання ваенных канфліктаў, якія адбываюцца цяпер у розных рэгіёнах свету. Мы чуем сотні, тысячы слоў з высокіх трыбун на гэты конт, але канкрэтных дзеянняў, асабліва ад вядучых геапалітычных гульцоў, ад якіх і залежыць гэтая сітуацыя, мы не бачым. Таму трэба сур'ёзна задумацца аб «новым сусветным парадку», які дапамог бы спыніць гэтыя канфлікты».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 06.10.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9176 | ▼ |
| Еўра | 2,1510 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0307 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0743 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# АДНОСІНЫ — УЗАЕМАВЫГАДНЫЯ

## Беларусь і Пакістан дамовіліся на працягу чатырох гадоў вывесці свой тавараабарот на ўзровень $1 млрд

**Учора ў Ісламабадзе прайшлі перагаворы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і прэм'ер-міністра Пакістана Наваза Шарыфа.**



Фота БЕЛТА.

Як паведаміў карэспандэнт БЕЛТА, перагаворы пачаліся з цырымоніі афіцыйнай сустрэчы лідараў дзвюх краін. У рэзідэнцыі прэм'ер-міністра Пакістана Прэзідэнта Беларусі вітала рота ганаровай варты. Затым Аляксандр Лукашэнка і Наваз Шарыф перайшлі ў рабочы кабінет прэм'ер-міністра для афіцыйных перагавораў, якія пройдуць спачатку ў фармаце «сам-насам», а затым — у пашыраным фармаце.

Аляксандр Лукашэнка і Наваз Шарыф пацвердзілі імкненне сваіх краін паглыбляць дружалюбныя сувязі ў розных сферах. У сумеснай заяве лідараў дзяржаў, якая была прынята па выніках афіцыйных перагавораў, адзначаецца, што сустрэча прайшла ў атмасферы высокага даверу і ўзаемаразумення. Бакі глыбока і ўсебакова разгледзелі ўвесь комплекс беларуска-пакістанскіх адносін, адзначыўшы ўзаемнае імкненне да далейшага развіцця і паглыблення дружалюбных сувязяў паміж дзяржавамі ў палітычнай, гандлёва-эканамічнай, сацыяльна-гуманітарнай і іншых сферах.

Аляксандр Лукашэнка і Наваз Шарыф канстатавалі важнасць падпісання шэрагу дакументаў, якія датычацца пашырэння напрамкаў узаемадзеяння ў сферах сельскай гаспадаркі, прамысловай кааперацыі, барацьбы са злачыннасцю, адукацыі, мытнага і банкаўскага супрацоўніцтва, у паштовай сферы.

Бакі пацвердзілі сваю прыхільнасць да агульнапрызнаных норм міжнароднага права, мэт і прынцыпаў Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, умацавання ролі ААН у вырашэнні ўсяго комплексу пытанняў па падтрыманні міжнароднага міру і бяспекі, процідзеянні сучасным выклікам і пагрозам, такім як міжнародны тэрарызм, распаўсюджванне зброі масавага знішчэння, незаконная вытворчасць і збыт наркотыкаў, гандаль людзьмі, прыродныя і тэхнагенныя катастрофы.

Па выніках сустрэчы была дасягнута дамоўленасць прадоўжыць практыку ўзаемнай падтрымкі ініцыятыў і кандыдатур дзвюх дзяржаў у ААН і іншых міжнародных арганізацыях.

Станоўча была ацэнена актыўная дзейнасць урадаў дзвюх дзяржаў па развіцці міждзяржаўнага супрацоўніцтва ў ключавых галінах эканомікі, а таксама работа сумеснай беларуска-пакістанскай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве.

Аляксандр Лукашэнка і Наваз Шарыф таксама віталі стварэнне ў парламентах дзвюх краін адпаведных груп дружбы.

Лідары краін выказалі зацікаўленасць у развіцці ўзаемавыгадных адносін паміж галіновымі міністэрствамі, актывізацыі прамых канта ктаў на ўзроўні сярэдняга і малога бізнесу, стварэнні на тэрыторыі Беларусі і Пакістана сумесных прадпрыемстваў у галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі (па перапрацоўцы мяса-малочнай і плодаагароднінная прадукцыі), лёгкай прамысловасці, фармацыі, лясной гаспадаркі.

СТАР. 2

## Ігар БОКІ: «Маё крэда — ісці з усмешкай па жыцці»

**Параалімпіяда ў Рыа-дэ-Жанэйра прынесла бабруйчаніну Ігару Бокаму неверагодны поспех. Ён сем разоў уздымаўся на пераможны п'едэстал і шэсць з іх — на найвышэйшую прыступку. У адзін момант ён стаў амаль нацыянальным героем Беларусі. У магілёўскім карпункце «Звязды», куды ён завітаў неўзабаве пасля вяртання на радзіму, «залаты» плывец чэсна прызнаўся, што цяпер атрымлівае столькі званкоў, што ледзь паспявае адказваць.**




— У Рыа я наогул адключаў тэлефон, каб цалкам засяродзіцца на спаборніцтвах, — усміхаецца ён. — Бадзёрасці надавалі тэлеграмы. Пасля першага «золата» мяне адразу ж павіншаваў наш Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Былі таксама тэлеграмы ад старшыні Бабруйскага гарвыканкама Андрэя Каваленкі, міністра спорту Аляксандра Шамко. Калі прыляцелі ў Мінск, нас сустракалі, як трыумфатараў. Усе віншавалі, было прыемна чуць, што ўсе так за нас хварэлі.

***— А як у Рыа рэагавалі на ваш поспех?***

— Сапраўды, я стаў любімчыкам параалімпійскага руху ў плаванні. Нават Міжнародны Параалімпійскі камітэт цяпер раіць звяртаць на мяне ўвагу і наведваць спаборніцтвы з маім удзелам. Маўляў, будзе цікава. Гэта вельмі ганарова для мяне. У Рыа ў мяне былі нават фанаты сярод бразільцаў.

СТАР. 4

■ Занятасць

## КІРАЎНІКУ ГАТЭЛЯ — 10 ТЫСЯЧ ДОЛАРАЎ У МЕСЯЦ

### САМЫЯ ВЫСОКААПЛАТНЫЯ ВАКАНСІІ Ў СТАЛІЦЫ І РЭГІЁНАХ

**Намесніку дырэктара раённай школы гатовы плаціць больш, чым кіраўніку фабрыкі сувеніраў, а каб узначаліць буйную кампанію, трэба ведаць чатыры замежныя мовы. Мы прагледзелі прапановы ў Агульнарэспубліканскім банку вакансій і высветлілі, каму сёння гатовы плаціць больш за астатніх.**

### Даплата за камандзіроўкі і іўрыт

Традыцыйна большасць прывабных месцаў — у сталіцы. Праўда, нават у Мінску вакансій з заоблачнымі заробкамі мала. З амаль дзевяці тысяч прапаноў толькі шэсць — з аплатай пяць тысяч рублёў у месяц і больш.

Столькі, напрыклад, абяцаюць дырэктару дэпартамента аднаго з банкаў. Каб заняць месца, трэба мець вышэйшую адукацыю (колькі б ні казалі, што наймальнікаў гэты фактар не хвалюе, дыплом універсітэта просяць усюды) і вопыт работы на кіраўніцкіх пасадах у еўрапейскіх банках ад пяці гадоў. Плюс адпавядаць кваліфікацыйным стандартам дзелавой рэпутацыі, якая прад'яўляецца да членаў праўлення ўстановы.

На 5,5 тысячы ў месяц шукаюць намесніка дырэктара па лагістыцы ў кампанію, якая вырабляе сокі і напоі. Вітаюцца кандыдаты з пяцігадовым вопытам на аналагічнай пасадзе і свабодным валоданнем англійскай мовай. Але на спакойную работу ў офісе не спадзявайцеся: кадравікі папярэджваюць, што давядзецца часта ездзіць у камандзіроўкі.

Заробак амаль у сем тысяч прапануюць чалавеку, які ўзначаліць кампанію па міжнародных кантэйнерных перавозках. Праўда, кандыдату на гэту пасаду трэба ведаць, акрамя англійскай, яшчэ літоўскую, кітайскую і арабскую мовы. З такімі патрабаваннямі заробак ужо не здаецца заоблачным.

СТАР. 3

# АДНОСІНЫ — УЗАЕМАВЫГАДНЫЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кіраўнікі Беларусі і Пакістана заявілі, што падтрымліваюць развіццё міжрэгіянальных сувязей як важнага складніка двухбаковых адносін, адзначылі неабходнасць актывізацыі ўзаемных візітаў дэлегацый, рэалізацыі сумесных праграм супрацоўніцтва на ўзроўні рэгіёнаў, удзелу ў рэгіянальных выставачна-кірмашовых і культурных мерапрыемствах.

Па выніках прайшоўшых перагавораў Аляксандр Лукашэнка заявіў, што Беларусь і Пакістан маюць намер выходзіць на цесную кааперацыю з трэцімі краінамі. «Дасягнута разуменне, што Беларусь і Пакістан выйдуць на цесную кааперацыю з трэцімі краінамі. Прыклад таго — кітайска-пакістанскі эканамічны калідор», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў Прэзідэнта, бакі абмеркавалі магчымасці супрацоўніцтва ў галіне ядзернай энергетыкі, пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «І Беларусь, і Пакістан — прыхільнікі развіцця мірнага атама».

У час сустрэчы было адзначана, што Беларусь і Пакістан павінны больш актыўна развіваць навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва. Гэтымі днямі ў Ісламабадзе быў адкрыты Беларуска-пакістанскі цэнтр па кардынацыі навукова-тэхнічнага і інавацыйнага супрацоўніцтва. «У час перагавораў дасягнута разуменне, што мы ўзмоцнім сумесную работу ў напрамку сельскагаспадарчай і прамысловай кааперацыі. У бліжэйшы час абмяняемся візітамі спецыялістаў для пашырэння супрацоўніцтва па гэтых напрамках, — расказаў кіраўнік дзяржавы. — У бліжэйшай перспектыве мы зробім канкрэтныя захады па актывізацыі супрацоўніцтва паміж банкамі, у лёгкай (пераважна тэкстыльнай) прамысловасці, у лясной гаспадарцы, мытнай справе, стандартызацыі і сертыфікацыі. Мы прапанавалі пакістанскім сябрам паслугі беларускіх кампаній па будаўніцтве».

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу, што наспела неабходнасць адкрыць паміж Беларуссю і Пакістанам прамыя паветраныя зносіны для павелічэння ўзаемнага пасажыра- і грузапатоку.

«Гэта далёка не поўны пералік пытанняў, якія мы абмяркоўвалі ў час візіту. Іх далейшае вырашэнне запатрабуе новых сустрэч і кантактаў, таму я з вялікім задавальненнем запрасіў майго сябра прэм'ер-міністра Наваза Шарыфа чарговы раз наведаць Беларусь у любы зручны для яго час. Для нас вельмі важна захаваць сістэмнасць у палітычным дыялогу і асабісты кантроль за выкананнем прынятых намі рашэнняў», — падкрэсліў беларускі лідар.

«Нашы падыходы да развіцця двухбаковых адносін не змяніліся з часу папярэдніх сустрэч. У мяне толькі ўмацавалася ўпэўненасць у шчырасці намераў пакістанскіх партнёраў развіваць дружалюбныя адносіны з Мінскам на прынцыпах узаемнага даверу і супрацоўніцтва», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі заўважыў, што Пакістан перажывае няпростыя часы, у прыватнасці, у адносінах з суседзямі.

«Вы ведаеце прыхільнасць маю і нашай дзяржавы да ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з суседзямі, мы жадаем вам міру», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэм'ер-міністр Пакістана Наваз Шарыф падзякаваў Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку за асабісты ўклад у інтэнсіўнае развіццё адносін паміж краінамі. Ён адзначыў, што чарговы візіт Прэзідэнта Беларусі з'яўляецца яркім знакам гатоўнасці краіны развіваць дружалюбныя адносіны з Пакістанам. «Я ўдзячны вам за асабісты ўклад у інтэнсіўнае развіццё нашага двухбаковага супрацоўніцтва. Абмен візітамі на вышэйшым узроўні прывёў да росту супрацоўніцтва і вывеў яго на якасна новы ўзровень», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

Паводле яго слоў, у час плённых перагавораў з Аляксандрам Лукашэнкам бакі дасягнулі дамоўленасцяў аб далейшым развіцці супрацоўніцтва ў розных сферах, у тым ліку ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, сферах адукацыі, культуры, навукі і тэхналогій. «З радасцю заяўляю, што мы падпісалі сумесную заяву па выніках сустрэчы, якая сведчыць аб цвёрдым намеры бакоў прадаўжаць супрацоўніцтва ў многіх сферах», — дадаў Наваз Шарыф.

Пазней у рэзідэнцыі прэм'ер-міністра Наваза Шарыфа з нагоды афіцыйнага візіту Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Пакістан адбылася ўрачыстая цырымонія гашэння мастацкіх паштовых марак.

Аляксандр Лукашэнка і Наваз Шарыф паставілі подпісы пад дзвюма маркамі, наклеенымі на паштовыя канверты, і змацавалі адной пячаткай адразу дзве маркі.

На марках адлюстраваны нацыянальны парк Беларусі «Нарачанскі» і нацыянальны парк Пакістана Сайфул-Мулук.

## Беларусь можа стаць для Пакістана інвестыцыйным акном у Еўропу

**Аляксандр Лукашэнка прыняў таксама ўдзел у адкрыцці IV Беларуска-пакістанскага дзелавога і інвестыцыйнага форуму.**

«Безумоўна, актывізацыя беларуска-пакістанскага інвестыцыйнага супрацоўніцтва будзе садзейнічаць росту эканомікі як Пакістана, так і Беларусі. І важная роля ў гэтым працэсе павінна належаць бізнесменам і прадпрымальнікам, якія сабраліся ў гэтай зале», — лічыць Прэзідэнт, які выступіў перад удзельнікамі мерапрыемства.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што да гэтага часу краіны не могуць пахваліцца поспехамі ў гэтым напрамку. «Аднак рост вашай эканомікі, павелічэнне яе магчымасцяў па замежным укладанні капіталаў ствараюць спрыяльныя перадумовы для таго, каб Беларусь па праву стала для Пакістана інвестыцыйным акном у Еўропу», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт заўважыў, што за апошні год Беларусь і Пакістан абмяняліся чатырма афіцыйнымі візітамі на вышэйшым і высокім узроўнях. У час кожнага праводзіліся дзелавыя і інвестыцыйныя форум, што сведчыць аб цвёрдым намеры бакоў развіваць плённыя адносіны паміж дзелавымі коламі дзяржаў.

«Мы дамовіліся з прэм'ер-міністрам на працягу чатырох гадоў вывесці наш тавараабарот на ўзровень $1 млрд. Як хочаце дамаўляйцеся паміж сабой, але праз чатыры гады $1 млрд, не менш (больш можна), павінен быць», — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да прадстаўнікоў дзелавых колаў абедзвюх краін.

«Звяртаючыся да ўдзельнікаў нашага форуму, я запрашаю пакістанскіх бізнесменаў укладваць інвестыцыі ў выгадныя для вас праекты на тэрыторыі Беларусі. Упэўнены, у такога супрацоўніцтва добрыя перспектывы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што ў Беларусі дзейнічае шэраг прэферэнцый, якія могуць быць карыснымі для замежных кампаній. «З пункту гледжання падатковага планавання і аптымізацыі прэферэнцыі ўключаюць спецыяльныя льготныя ўмовы гаспадарання пры арганізацыі бізнесу ў рамках шасці свабодных эканамічных зон. Замежныя кампаніі таксама могуць атрымаць дадатковую выгаду, максімальна знізіўшы інвестыцыйныя затраты і падатковую нагрузку пры ўкладанні капіталаў у нашых малых і сярэдніх гарадах», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка таксама расказаў аб актыўным будаўніцтве пад Мінскам Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень» — у гэтым міжнародным праекце жадаюць удзельнічаць кампаніі розных краін. Асаблівую ўвагу Прэзідэнт акцэнтаваў на транспартна-лагістычных магчымасцях Беларусі, праводзімай у краіне палітыцы «кропкавай» прыватызацыі і кадравым патэнцыяле рэспублікі.

■ Вынікі і высновы

# Будучае палітычнай сістэмы

**Амаль 20 экспертаў сабраліся на «круглы стол» «Парламентарызм праз прызму ментальнасці беларускага грамадства». Яны прааналізавалі сённяшнюю палітычную сістэму і далі прагноз яе развіцця на заўтра. Наш карэспандэнт запісаў самыя цікавыя думкі беларускіх і замежных аналітыкаў.**

**Кандыдат палітычных навук Святлана ПАРЭЧЫНА:**

— Парламентарызм — гэта арганізацыя дзяржаўнай улады пры дамінуючай ролі парламента. Натуральна, трэба падумаць, якім чынам можна павысіць яго ролю як прадстаўнічага і заканадаўчага органа і наколькі гэта адпавядае чаканням нашых грамадзян. Навучыцца палітыцы можна толькі на практыцы. Папершае, нашы дэпутаты павінны больш удзяляць увагі выкананні законаў. Працаваць на месцах, кантраляваць. Па-другое, у нас ёсць выпадкі, калі парламент не вылучаў ні аднаго законапраекта за год. Я лічу, гэта ненармальна. Прычына ў тым, што ў нас парламент не структураваны. У нас няма не тое што фракцый, нават дэпутацкіх груп. І вось адным са шляхоў па дасягненні гэтага, на маю думку, павінна быць фарміраванне партыйнай сістэмы. Справа ў тым, што партыі — гэта добраахвотныя аб'яднанні грамадзян, таму якое грамадства, такія і палітычныя партыі. З іншага боку, зарэгістраваных кандыдатаў, якія з'яўляюцца прадстаўнікамі палітычных партый, было 63%, а ў складзе парламента іх не так шмат...

**Дырэктар інфармацыйна-асветніцкай установы «Актуальная канцэпцыя», палітычны аналітык Аляксандр ШПАКОЎСКІ:**

— Мне ўяўляецца, што крытыка беларускага выбарчага заканадаўства, якая часам гучыць ад некаторых назіральнікаў, па меншай меры, неабгрунтаваная. Яўка на парламенцкіх выбарах забяспечваецца з дапамогай такіх механізмаў, як, напрыклад, агітацыя — гэта вельмі «мяккі» механізм. Калі браць заканадаўства еўрапейскіх дзяржаў, напрыклад, бельгійскае, свядомая няяўка грамадзяніна на ўчастак можа пацягнуць за сабой адміністрацыйнае пакаранне ў выглядзе грашовага штрафу. У шэрагу краін допускаецца галасаванне па пошце, па інтэрнэце. Тым не менш, нягледзячы на ўсе гэтыя хітрыкі, часцяком яўка аказваецца значна ніжэйшай за беларускую.

**Доктар эканамічных навук Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта Мікалай МЯЖЭВІЧ:**

— Калі шмат гадоў запар нашы партнёры з Захаду даюць набор рэкамендацый і ў іх гучаць прыкладна адны і тыя ж рэчы, у тым ліку пра шматпартыйнасць, узнікае думка, ці не атрымліваецца так, што нам прасоўваюць загадзя непаўнацэнны ў рэшце рэшт рэцэпт. Таму што самі яны сутыкнуліся з недастатковай эфектыўнасцю рэалізацыі гэтай мадэлі ў сябе.

**Кіраўнік Кансерватыўнага цэнтра «NOMOS» Пётр ПЯТРОЎСКІ:**

— Дзяржава сёння зацікаўлена ў некаторай палітычнай трансфармацыі. Краіны, дзе зарадзіўся парламентарызм, існуюць палітычныя партыі, сёння мажарытарныя — Францыя, Вялікабрытанія. Іншае пытанне ў тым, што ў нас за перыяд незалежнасці вырас прыватны сектар, у якім ідэалагічная работа старымі шляхамі, праз вертыкаль, праводзіцца не можа. Ёй займаюцца палітычныя партыі знешняга сегмента, якія навучылі працаваць менавіта з гарызантальнымі сувязямі. Калі дзяржава не будзе займацца гэтым прыватным сектарам, то фактычна мы аддадзім гэта на водкуп тым няўрадавым арганізацыям і палітычным партыям, якія існуюць дзякуючы дапамозе з-за мяжы.

**Палітолаг, доктар палітычных навук Віктар ВАТЛЬ:**

— Сярэднестатыстычны ўдзельнік выбараў — гэта чалавек 35—40 гадоў, які валодае пэўным вопытам кіравання. Нам не зашкодзіла б сёння ўзмацніць юрыдычны і кіраўнічы рэсурс для будучых дэпутатаў, які дазволіць нам больш якасна дасягаць пастаўленых мэтаў. Дасць магчымасць стварыць прадуктыўную праграму дзеяння.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

■ Парламенцкі дзённік

# З АКЦЭНТАМ НА САЦЫЯЛКУ

## Дэпутаты завяршылі работу над галоўнымі фінансавымі дакументамі на 2017 год

**Учора ў другім чытанні Палата прадстаўнікоў разгледзела рэспубліканскі бюджэт на наступны год. Парламентарыі называюць законапраект рэалістычным і спадзяюцца, што дакумент не прыйдзецца істотна карэктаваць у будучыні.**

### 32% бюджэту — на дзяржпраграмы

**Валерый БАРАДЗЕНЯ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах**, звярнуў увагу, что бюджэт дэпутаты адпрацавалі вельмі істотна.

— Сёння другое чытанне, але на самай справе гэта ўжо пятае вельмі прадметнае абмеркаванне ў парламенце праекта закона аб рэспубліканскім бюджэце і ўнясення змяненняў у Падатковы кодэкс, — кажа ён. — Яно праходзіла ў камісіях, на пашыраным пасяджэнні камісіі па бюджэце і фінансах, пасля было так званае нулявое чытанне з удзелам прэм'ер-міністра, таму вельмі шмат пытанняў ужо знята. Думаю, што мы павінны спадзявацца на тое, што гэта рэалістычны бюджэт, што закладзеныя параметры будуць выкананы і што бюджэт не прыйдзецца істотна карэктаваць.

**Людміла ДАБРЫНІНА, старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах** звярнула ўвагу на традыцыйную сацыяльную скіраванасць рэспубліканскага бюджэту.

— Агульны аб'ём фінансавання дзяржаўных праграм з рэспубліканскага бюджэту ў 2017 годзе складзе 5,562 млрд рублёў, або 33,2% усіх выдаткаў бюджэту, — праінфармавала дэпутат. — Фонд аплаты працы ў бюджэтным сектары запланаваны з ростам у межах 9%.

У другім чытанні быў прыняты законапраект «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Падатковы кодэкс Рэспублікі Беларусь». Дакумент прыводзіць Падатковы кодэкс у адпаведнасць з не так даўно прынятымі ў новай рэдакцыі Лясным кодэксам, Кодэксам аб культуры, Законам «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях натурыяльнай дзейнасці», змяненнямі і дапаўненнямі ў Закон «Аб знешняй працоўнай міграцыі», а таксама ў адпаведнасці з указамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

### ...Прыйдзецца напружыцца

**Валянцін РЫБАКОЎ, намеснік міністра замежных спраў**, прадстаўляючы праект закона «Аб ратыфікацыі Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Туркменістана аб узаемным заахвочванні і абароне інвестыцый», адказаў на пытанні дэпутатаў пра будаўніцтва Гарлыкскага горна-ўзбагачальнага камбіната ў Лебапскім велаяце Туркменістана.

— Тэрмін здачы аб'екта паводле кантракта — 31 сакавіка 2017 года, — адзначыў намеснік міністра. — На вялікі жаль, мы сапраўды сутыкнуліся з цэлым шэрагам праблем пры будаўніцтве гэтага аб'екта. На яшчэ больш вялікі жаль, праблемы вельмі часта звязаны з пэўнай маруднасцю, неактыўнасцю, нерухавасцю беларускіх суб'ектаў гаспадарання. Паколькі гэтае пытанне не зусім адносіцца да МЗС, то я магу толькі сказаць, што робіцца ўсё, каб гэты аб'ект быў пабудаваны, пабудаваны годным чынам, здадзены ў эксплуатацыю ў адпаведныя тэрміны, хоць для гэтага і прыйдзецца напружыцца.

### Без віз у... Макаа

Сярод шэрагу законапраектаў, прынятых учора, трэба назваць ратыфікацыю Пагаднення паміж Урадам нашай краіны і Урадам Спецыяльнага адміністрацыйнага раёна Кітайскай Народнай Рэспублікі Макаа аб узаемнай адмене віз.

— На сучасным этапе адносіны паміж Беларуссю і Макаа развіваюцца дастаткова дынамічна ў кантэксце пазітыўнага супрацоўніцтва ў цэлым з Кітайскай Народнай Рэспублікай, — канстатаваў Валянцін Рыбакоў. — Улічваючы значэнне Макаа ў якасці буйнога фінансавага, прамысловага, турыстычнага і транспартнага цэнтра ў Азіі, а таксама станоўчы вопыт устанаўлення Макаа бязвізавых рэжымаў з Расіяй, Украінай, Казахстанам, спрашчэнне рэжыму паездак для грамадзян у кантэксце палітычных адносін будзе мець пазітыўны эфект.

Адказваючы на пытанне **дэпутата ад Гомельскай-Цэнтральнай выбарчай акругі №33 Алега ЛЕЎШУНОВА** пра магчымасць спрашчэння візавага рэжыму для беларусаў замежжа, Валянцін Рыбакоў заявіў:

— Спрашчэнне візавага рэжыму — тая мера, якая можа дазволіць павялічыць колькасць прыязджаючых і турыстаў, і дзелавых людзей у Рэспубліку Беларусь. Гэта магло б садзейнічаць і ўстанаўленню асабістых кантактаў, іх пашырэнню. На жаль, гэтае пытанне дастаткова комплекснае, у яго вырашэнні ўдзельнічаюць некалькі іншых арганізацый, акрамя Міністэрства замежных спраў. Мы робім усё, каб усяляк падтрымліваць, у тым ліку і такімі мерамі, беларусаў, якія пражываюць за мяжой нашай краіны.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

*yushkevich@zviazda.by*

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання, дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага і другога скліканняў ЯГОРАВА Уладзіміра Дзям'янавіча і выказваюць шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**

**Калегія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, ветэраны органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю генерал-палкоўніка ЯГОРАВА Уладзіміра Дзям'янавіча, у мінулым — міністра ўнутраных спраў Беларусі, і выказваюць шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**

## НЕВЫРАШАЛЬНЫХ ПРАБЛЕМ НЕ БЫВАЕ

У суботу ў краіне адбудуцца чарговыя прамыя тэлефонныя лініі

**Практыка падобных зносін паміж жыхарамі краіны і мясцовымі ўладамі працягваецца ўжо больш за год. Кожную суботу беларусы могуць задаць пытанні і агучыць надзённыя праблемы чыноўнікам па тэлефоннай сувязі. Такі спосаб узаемадзеяння створаны з мэтай павышэння эфектыўнасці працы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення бюракратызму і цяганіны, а таксама для апаратыўнага рашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.**

**8 кастрычніка з 9.00 да 12.00 на пытанні будуць адказваць:**

**Брэсцкі аблвыканкам** намеснік старшыні САКОЎСКІ Віктар Яўгенавіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам** намеснік старшыні БЕЛАВУС Уладзімір Мікалаевіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам** старшыня абласнога Савета дэпутатаў БАРЫСЕНКА Алег Леанідавіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам** намеснік старшыні ДЗЯШКО Уладзімір Іосіфавіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам** намеснік старшыні ЯНКОЎ Дзмітрый Васільевіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам** намеснік старшыні НЕЎМЯРЖЫЦКІ Сяргей Пятровіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам** першы намеснік старшыні КУХАРАЎ Уладзімір Яўгенавіч (80172224444).

■ З нагоды

# СКАРБ ГІСТОРЫІ

### У архівах Беларусі захоўваюцца дакументы з XIV стагоддзя. Самы стары дакумент датуецца 1391 годам

**Амаль 13 мільёнаў адзінак захоўвання на папяровай аснове, больш як 200-кіламетровая даўжыня стэлажных паліц з дакументамі — так выглядае сёння архіўная галіна краіны. А яшчэ гэта 6 рэспубліканскіх, 9 абласных, 16 занальных і 124 раённыя архівы, а таксама два навукова-даследчыя інстытуты, дзве лабараторыі і ведамасныя архівы.**

Штогод дзяржаўнымі архіўнымі ўстановамі краіны выконваецца больш як 3 тысячы тэматычных, каля 13 тысяч біяграфічных, каля 300 генеалагічных і амаль 30 тысяч запытаў сацыяльна-прававога характару.

— Для таго каб даследчыку было прасцей карыстацца архіўнымі дакументамі, мы ідзём у нагу з часам, — адзначыў **дырэктар Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Беларусі Уладзімір АДАМУШКА.** — Пачынаючы з 1 кастрычніка 2012 года, у глабальнай сетцы змешчаны Дзяржаўны фондавы каталог Нацыянальнага архіўнага фонду Беларусі. Сёння, зайшоўшы ў інтэрнэт, можна ўбачыць, якім багаццем мы валодаем. Таксама, але пакуль у тэставым рэжыме, працуе Сістэма адкрытага доступу да дакументаў Нацыянальнага архіўнага фонду Беларусі.

У архівах нашай краіны актыўна вядзецца праца па пераводзе дакументаў на лічбавыя носьбіты. «На цяперашні момант мы працуем над аблічбоўкай вопісаў: каб у даследчыка быў навукова-даведачны апарат, па якім можна знайсці любы дакумент, — тлумачыць Уладзімір Адамушка. — Паставілі перад сабой задачу ў першую чаргу перавесці ў лічбавы фармат страхавы фонд Нацыянальнага архіўнага фонду. А гэта амаль 400 тысяч каштоўных дакументаў, без якіх нельга казаць пра гісторыю Беларусі. Потым мы пяройдзем да дакументаў, найбольш запатрабаваных у нашых даследчыкаў. Ужо амаль поўнасцю, на 70%, аблічбаваны фота- і гукадакументы».

Актыўна развіваецца міжнароднае супрацоўніцтва дзяржаўных архіваў нашай краіны з аналагічнымі ўстановамі замежжа. У тым ліку ажыццяўляецца перавод у Нацыянальны архіўны фонд дакументаў, звязаных з гісторыяй Беларусі, якія захоўваюцца ў архівах іншых дзяржаў. Не сакрэт, што арыгіналамі не хоча дзяліцца ні адзін архіў свету. Але робяцца копіі, створана спецыяльная база даных дакументаў, якія захоўваюцца ў замежных архівах.

— Мы пайшлі шляхам сумеснай выставачнай дзейнасці і сумеснага выдання зборнікаў дакументаў, — расказаў дырэктар Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі. — У нас ёсць копіі гэтых дакументаў, прыдатных для выкарыстання. У XXI стагоддзі нам не столькі патрэбны арыгінал, галоўнае ў дакуменце — першасная інфармацыя. Вядома, нам хацелася б мець Тураўскае Евангелле, якое захоўваецца ў Літве, але не ўсё так проста.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■ Грамадская супольнасць

## НАША ГІСТАРЫЧНАЯ МІСІЯ — МІРАТВОРЧАЯ

**Такое меркаванне выказаў старшыня Рэспубліканскага саюза грамадскіх аб'яднанняў «Беларускі камітэт маладзёжных арганізацый» Аляксандр ЮШКЕВІЧ на пасяджэнні клуба «Адкрыты дыялог», арганізаваным БРСМ. Беларускія і замежныя эксперты сустрэліся, каб абмеркаваць тэму «25 гадоў без Саюза: страты і набыткі. Погляд з Еўропы».**

Галоўным госцем сустрэчы стаў вядомы італьянскі журналіст Джульета К'ЕЗА. У сваім выступленні ён абазначыў асноўныя накірункі гутаркі. Так, эксперты абмеркавалі не толькі гістарычныя перадумовы распаду СССР, але і гульню палітычных сіл на сусветнай арэне, якую мы назіраем сёння. Спадар К'еза адзначыў, што такі фармат мерапрыемстваў быў бы карысным і для італьянскай моладзі, дапамог бы больш якасна разбірацца ў палітыцы.

Падчас «Адкрытага дыялогу» правялі сацыялагічнае апытанне экспертаў. У выніку высветлілася, што да галоўных страт, якія адбыліся з распадам СССР, 30% аднеслі стратэгічную бяспеку і геапалітычны ўплыў на іншыя краіны, 23% — выраўную ідэалогію і маральныя арыенціры, 18% — дружбу народаў, 13% — даступнасць рэсурснай базы і шырокі рынак збыту. Але шмат што мы атрымалі: 50% апытаных аднеслі перш за ўсё незалежнасць дзяржавы, магчымасць самастойна прымаць рашэнні, 12% — нацыянальную самасвядомасць, 9% — рыначную эканоміку.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■ Узровень

## Цэнтры асветы

### Падчас міжнароднага кангрэсу ў Мінску адзначаны найлепшыя бібліятэкі

**Больш як 500 дэлегатаў з розных краін — Азербайджана, Беларусі, Вялікабрытаніі, Францыі, Германіі, Казахстана, Малдовы, Польшчы, Расіі, Украіны і ЗША — прынялі ўдзел у IV Міжнародным кангрэсе «Бібліятэка як феномен культуры», які гэтымі днямі праходзіць у беларускай сталіцы. Падчас урачыстага адкрыцця мерапрыемства былі ўганараваны найлепшыя бібліятэкі нашай краіны.**

Сёлета ўжо другі раз падвялі вынікі конкурсу «Бібліятэка — цэнтр духоўнай асветы і выхавання». Епіскап Барысаўскі і Мар'інагорскі Веніямін асабіста ўручаў узнагароды пераможцам. Гран-пры конкурсу атрымаў дырэктар фундаментальнай бібліятэкі БДУ Уладзімір Кулажэнка. У намінацыі «Духоўна-маральнае выхаванне дзяцей і моладзі» дыпломам першай ступені ўзнагароджаны метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу Пружанскай раённай цэнтралізаванай сістэмы Ніна Шабуня, а таксама загадчыца бібліятэкі вілейскай гімназіі №1 Ірына Гулецкая і бібліятэкар ізабелінскай сельскай бібліятэкі Ганна Свістун. У намінацыі «Гісторыя праваслаўя роднага краю» ўзнагароджаны Галіна Юркевіч — бібліятэкар Свята-Богаяўленскага Куцеінскага мужчынскага манастыра і Валянціна Валковіч — загадчыца Бездзежскай сельскай бібліятэкі. У намінацыі «Сям'я — пераемніца духоўных і маральных каштоўнасцяў» уганараваны дырэктар краязнаўчага цэнтра Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі Галіна Слесарэнка і галоўны бібліятэкар Пінскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі Тацццяна Баговіч. За перамогу ў намінацыі «Патрыятычнае выхаванне на праваслаўных традыцыях» узнагароду атрымлівала дырэктар Клімавіцкай бібліятэчнай сеткі Тацццяна Даменікан.

Як адзначыў падчас урачыстага адкрыцця кангрэсу **дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман МАТУЛЬСКІ,** сёння ў нашай краіне на адну публічную бібліятэку прыпадае 3350 карыстальнікаў. Прычым у горадзе — гэта 12 500 чытачоў, што наведваюць адну ўстанову, а ў вёсцы — амаль 950 чалавек. Ён адзначыў, што згодна са статыстычнымі даследаваннямі за апошнія пяць гадоў было закрыта надзвычай шмат бібліятэк, асабліва сельскіх. Аднак на пытанне, колькі бібліятэк патрэбна сучаснаму грамадству, адказаць даволі складана...

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

■ Ну і ну!

## У сталіцы ў прыпарканае аўто ўехалі двойчы

### Адзін з вінаватых да прыезду ДАІ паспеў аформіць страхоўку

**У Мінску ў аўтамабіль, пакуль ён стаяў на паркоўцы, за кароткі прамежак часу ўрэзаліся дзве іншыя машыны.**

Паводле інфармацыі АДАІ Маскоўскага раёна сталіцы, увечары на вуліцы Карла Лібкнехта дзяўчына прыпаркавала аўтамабіль «Хонда» і пайшла па справах. Вярнуўшыся літаральна праз дзесяць хвілін, яна ўбачыла, што ў яе машыну ўехаў аўтамабіль «Форд», якім кіраваў хлопец. Пакуль кіроўцы размаўлялі, з процілеглага боку вуліцы выехаў аўтамабіль «Рэно». Яго кіроўца не разлічыў адлегласць і ўрэзаўся зноў у машыну дзяўчыны.

Калі на месца двайнога дарожна-транспартнага здарэння прыбылі супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі, кіроўца «Рэно» прад'явіў ім страхоўку грамадзянскай адказнасці, афармленую ў... 17.50. А аварыя здарылася ў 17.30. Высветлілася, што кіроўца паспеў паміж аварыяй і прыездам супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі збегаць у найбліжэйшае страхавое агенцтва на гэтай жа вуліцы і аформіць страхоўку, якой у яго не было. Падман быў раскрыты. Цяпер абодва кіроўцы заплацяць штрафы за парушэнне Правілаў дарожнага руху, што пацягнула пашкоджанне транспартнага сродку. А кіроўца «Рэно» дадаткова аштрафаваны на 210 рублёў за адсутнасць страхоўкі на момант аварыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# КІРАЎНІКУ ГАТЭЛЯ — 10 ТЫСЯЧ ДОЛАРАЎ У МЕСЯЦ



Статыстыка

**У Агульнарэспубліканскім банку вакансій цяпер налічваецца каля 40 тысяч свабодных месцаў. З іх 55 працэнтаў прапануюць заробак, меншы за 400 рублёў. Яшчэ траціна — з аплатай 400—600 рублёў у месяц. Заробак у 600—800 рублёў абяцаюць на кожнай дзясятай вакансіі. Доля свабодных месцаў, дзе гатовы плаціць ад 800 да 1000 рублёў, складае тры працэнты, а прапаноў з аплатай у тысячу рублёў і больш — менш за два працэнты.**

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

16 тысяч (а гэта 8 тысяч долараў) абяцае свайму менеджару Парк высокіх тэхналогій. Саіскальніку неабходна выдатна валодаць англійскай моваю і іўрытам, мець вопыт у распрацоўцы праграмнага забеспячэння і стаж работы на пасадзе менеджара ў замежных кампаніях не менш за два гады.

Самую ж высокааплатную вакансію ў Мінску выставіў гатэль «Марыёт». Там шукаюць кіраўніка гасцініцы і прапануюць заробак у 19,3 тысячы рублёў (10 тысяч долараў)!

— Не, ніякай памылкі няма, — запэўнілі нас у самім гатэлі. — Такі заробак абумоўлены высокімі патрабаваннямі да кваліфікацыі.

Сапраўды: каб заняць гэтую пасаду, трэба валодаць англійскай і турэцкай мовамі, кіраваць гасцініцамі «пяць зорак» больш за сем гадоў і працаваць у сетцы «Марыёт» мінімум год. Як нам паведамілі ў гатэлі, пакуль ёсць толькі адзін прыдатны кандыдат і ён замежнік.

### Максімум у тысячу рублёў

У абласных гарадах прапановы больш сціплыя. Так, самы вялікі заробак, які прапануюць саіскальнікам у Гродне, — 4,6 тысячы рублёў. Столькі гатовы плаціць намесніку генеральнага дырэктара кампаніі, якая выпускае сухія будаўнічыя сумесі. З патрабаванняў — ведаць дасканала англійскую і польскую мовы і працаваць па найноўшых тэхналогіях не менш за пяць гадоў.

У Гомелі найбольш аплатныя свабодныя месцы — для інжынераў-праграмістаў. Філіял замежнай айці-кампаніі шукае двух работнікаў і прапануе тры тысячы ў месяц. Згодна са статыстыкай, гэта сярэднестатыстычны заробак праграміста.

Максімум, на які могуць разлічваць цяперашнія саіскальнікі ў Брэсце, — тысяча рублёў. Такі заробак чакае дырэктара фабрыкі сувеніраў «Славянка». Ідэальны кандыдат — з вышэйшай адукацыяй і вопытам работы ў дрэваапрацоўцы на кіраўніцкіх пасадах не менш за тры гады.

У Віцебску падобная сітуацыя. Амаль 1,2 тысячы рублёў можа атрымліваць галоўны інжынер, які будзе адказваць за будаўніцтва і рамонт дарог. Тысячу абяцаюць таксама начальніку ўпраўлення вучэбнага цэнтра прадпрыемства «Віцебскэнерга». Каб заняць пасаду, неабходны стаж у галіне энергетыкі і на кіраўніцкіх пасадах мінімум пяць гадоў.

Сярод вакансій, якія зараз адкрыты ў Магілёве, больш прапаноў па заробку, чым тысяча рублёў у месяц, няма. Гэты максімум гатовы плаціць, напрыклад, начальніку аддзела збыту і сыравіны на мясакамбінаце. Ці кухару ў рэстаране: каб прэтэндаваць на прывабнае месца, неабходны шосты разрад, пяцігадовы вопыт у прыгатаванні італьянскай страў і выдатная італьянская мова. Тую ж тысячу рублёў абяцаюць будучаму дырэктару дрэваапрацоўчага прадпрыемства і патрабуюць ад кандыдата, акрамя стажу работы ў галіне, ведаць англійскую, латышскую, нямецкую мовы і мець уласнае аўто.

### Прапановы ад півавараў і піцэрыі

Лічыцца, што ў правінцыі немагчыма знайсці высокі заробак. Мяркуючы па вакансіях, можна. Што цікава, у асобных райцэнтрах гатовы плаціць больш чым у абласных гарадах.

У Полацку заробак у 1200 рублёў абяцаюць спецыялісту па развіцці сеткі піцэрый. З неабходнага — мінімум тры гады вопыту ў сферы грамадскага харчавання. Такі ж заробак можна атрымліваць і ў Буда-Кашалёве — на пасадзе намесніка дырэктара па сувязях з інвестарамі. Працадаўца — кампанія, якая выпускае пластыкавую тару і ўпакоўкі.

Саіскальнікі ў Іванаве могуць прыглядзецца да вакансіі ў півапарнай прамысловасці. Заводу «Белсолад» патрабуецца намеснік генеральнага дырэктара па маркетынгу і збыце. Ад вас — дыплом універсітэта, трохгадовы стаж і англійская мова. Ад наймальніка — 1400 рублёў у месяц.

У Воранаўскім раёне шукаюць намесніка дырэктара ў Пяляскую сярэднюю школу з навучаннем на літоўскай мове. Ведаць яе — абавязкова. Заробак складае амаль дзве тысячы рублёў. У гэтую ж школу патрабуецца і настаўнік, які будзе на літоўскай мове выкладаць геаграфію, хімію і біялогію. Педагогу абяцаюць 1800 рублёў у месяц.

Рэкордны для райцэнтра заробак прапануюць у Смалявічах. Прывабныя вакансіі выставіў Кітайска-беларускі індустрыяльны парк. Запрашаюць працаваць дырэктарамі. Адзін будзе займацца фінансавымі паслугамі (заробак — 2,4 тысячы рублёў), іншы — будаўніцтвам (2,7 тысячы). З патрабаванняў — вопыт у галіне і добрая кітайская мова. Але, відаць, кандыдаты з такой кваліфікацыяй ацэньваюць сябе куды вышэй: месцы вакантныя ўжо два месяцы.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by.*

# «МАЁ КРЭДА — ІСЦІ З УСМЕШКАЙ ПА ЖЫЦЦІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— У вашай скарбонцы шмат залатых медалёў. Ці ёсць у вас годныя сапернікі сярод аднагодкаў?***

— Канешне. Адсочваю іх выступленні і стараюся дасягаць не горшых вынікаў. Ёсць украінец — Яраслаў Дзенісенка, мы амаль ушчыльную ідзём з ім на адной дыстанцыі. Таму трэба быць напагатове.

***— Ён таксама змагаўся ў Рыа?***

— Так. Ён, здаецца, заваяваў 4 медалі.

***— Вам пашчасціла ў 22 гады стаць удзельнікам дзвюх Параалімпіяд — у Англіі і зараз у Бразіліі. Якія змены адбыліся за гэтыя 4 гады?***

— Для мяне гэтыя Параалімпіяды розныя, таму што на першую я ехаў звычайным удзельнікам, а на гэтую ўжо тытулаваным спартсменам. Гэта накладала адбітак адказнасці. Я не мог не справіцца з заданнем, якое на мяне ўскладаліся. Абедзве Параалімпіяды падобны толькі тым, што гэта самыя вялікія спаборніцтвы ў чатыры гады, у якіх удзельнічаюць усе вядучыя спартсмены. Арганізацыя была ўсюды добрая, харчаванне вялікі выбар. У Рыа былі крыху не такія ўмовы, як у Лондане, але для стартаў, для падрыхтоўкі ніякіх перашкод не было. Былі створаны ўмовы, якія адпавядалі ўсім патрабаванням.



Фота БЕЛТА.

***— А час недзе пабываць, нешта паглядзець быў?***

— Пасля стартаў нас павезлі на экскурсію. Былі побач з акіянам, але не выходзілі з аўтобуса, бо нас папярэдзілі, што на пляжы небяспечныя бактэрыі і там лепш не гуляць. Бачылі знакамітую статую Ісуса Хрыста на вяршыні гары Каркаваду. Адтуль адкрываецца панарама горада і бухты з маляўнічай гарой Цукровая Галава. Усё вельмі прыгожа, вельмі спадабаліся пейзажы. Было вельмі цёпла, хоць гэта пара года ў іх лічыцца зімой.

***— Якія падарункі паспеў ужо атрымаць на радзіме самы тытулаваны спартсмен Параалімпіяды-2016?***

— Пакуль што толькі Бабруйск выдзеліў мне прэмію.

***— А наогул часта прыходзіцца бываць дома — у гэтым горадзе?***

— Прыязджаю і да бацькоў, і на зборы. Вельмі люблю Бабруйск. Менавіта тут пачынаўся мой шлях у спорт.

***— Вашы бацькі таксама былі спартсменамі?***

— Бацька, дарэчы, займаўся плаваннем і яшчэ некалькімі відамі спорту. Былі нейкія дасягненні, але нядоўга. Тады наогул быў іншы час, свае складанасці. Цяпер спорт для маіх бацькоў у мінулым, але яны вядуць дастаткова актыўны лад жыцця. Катаюцца на веласіпедах.

***— А вы як трапілі ў спорт? За кампанію з бацькам?***

— На плаванне мяне прывяла маці. Яна прыслухалася да парад урачоў, якія сказалі, што паколькі ў хлопчыка праблемы са зрокам, плаванне — лепшы сродак накіраваць яго энергію ў патрэбным рэчышчы. Да таго ж гэта пойдзе толькі на карысць і не пагоршыць зрок.

***— Вас прывялі ў плаванне, і вы адразу паказалі сябе з лепшага боку? Напэўна сталі першым сярод вучняў?***

— Любімчыкам не быў, знаходзіўся дзесьці ў сярэдзіне. А потым стаў больш актыўна развівацца. З той групы, з якой я пачынаў займацца, сёння застаўся толькі я адзін. З Бабруйска ў Мінск пераехаў, калі хадзіў у восьмы клас. Працягваю дагэтуль трэніравацца там.

***— Цалкам аддаяце сябе спорту? Нічым іншым не займаецеся?***

— Пакуль так. Люблю глядзець сучасныя камедыі.

***— Што найскладаней даецца ў спорце?***

— Брас пакуль для мяне самы складаны від плавання. Але я зрабіў для сябе прарыў. У Лондане на гэтай дыстанцыі заняў 8-е месца, а зараз 3-е. Гэта для мяне вялікае дасягненне. Дзякуй за гэта майму мінскаму трэнеру Генадзю Вішнякову. Шмат што для мяне зрабіла і мой першы трэнер Наталля Пазнякова.

***— Якія цяпер мэты ставіце перад сабой у спорце?***

— Наперадзе яшчэ хапае вяршынь, якія хочацца пакарыць. Буду імкнуцца дасягаць лепшых вынікаў, перамагаць самога сябе.

***— А хто вас у гэтым падтрымлівае?***

— У першую чаргу мае бацькі, брат Яўген і мая дзяўчына Вольга.

***— Вы хочаце сказаць, што сэрца самага тытулаванага спартсмена Параалімпіяды-2016 ужо занята?***

— Так *(усміхаецца)*.

***— Яна бабруйчанка?***

— Так. Але вучыцца ў Мінску ў БДУ на філалагічным факультэце.

***— Для свайго малодшага брата вы, напэўна, кумір і ўзор для пераймання?***

— Ён — галоўны мой балельшчык і таксама займаецца плаваннем.

***— Зараз куды вашы думкі накіраваны? Што збіраецеся ў бліжэйшы час здзейсніць?***

— Планую з'ездзіць з дзяўчынай, бацькамі і братам у адпачынак у якую-небудзь цёплую краіну. Адпачыць эмацыянальна і псіхалагічна.

***— Вам падабаецца падарожнічаць? У якіх краінах паспелі пабываць?***

— Калі шчыра, цяжка сказаць. Шмат дзе бываў. Але кожны раз прыемна вяртацца дадому ў Беларусь. А так, цікава ўсюды пабываць. Зараз хочацца туды, дзе цёпла. Але, каб пералёт быў нядоўгі. 16 гадзін лёту з Рыа — гэта было цяжкавата.

***— Пасля адпачынку зноў трэніроўкі?***

— Буду актыўна рыхтавацца да будучых стартаў. У наступным годзе, у верасні, — чэмпіянат свету па плаванні ў Мексіцы.

***— У далёкім будучым кім сябе бачыце?***

— Пакуль у мяне няма такіх доўгатэрміновых планаў, не задумваюся пра сваё далёкае будучае. Буду займацца спортам, наколькі доўга гэта будзе магчыма. А далей — як жыццё складзецца.

***— Ваша крэда?***

— Ісці па жыцці з усмешкай і ўмець радавацца дробязям.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

*zigulya@zviazda.by*

# У ГЛУШУ ПА НАСТРОЙ

**Свой сёмы фестываль народных промыслаў і рамёстваў «Глушанскі хутарок» пасёлак адзначыў з размахам.**

Гэта сапраўднае свята ў народных традыцыях са спевамі, гульнямі, пасядзелкамі за вялікім святочным сталом, дзе ўсяго багата. Сем гадоў таму яго ініцыявала старшыня Глушанскага пасялковага Савета Марыя Сушчанка, напісаўшы адпаведны праект і атрымаўшы фінансавую падтрымку ПРААН «Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні». Глушанцам ідэя спадабалася і фэст стаў традыцыйным. Цяпер кожны год на гасцінным пляцоўцы Цэнтра рамёстваў шуміць вясёлы кірмаш, запрашаюць каларытныя беларускія падворкі, працуюць невялічкія майстэрні пад адкрытым небам, гучаць жартаўлівыя прыпеўкі.









Сёлета свята набыло статус раённага, яго праграма стала шырэйшай. Упершыню госці скарысталіся магчымасцю пакружыць над жывапісным месцам на самалёце, паназіраць за рыцарскімі забавамі. А чаму б і не? Глушы хоць і не было ў Сярэднявеччы, але ж гэта не значыць, што тутэйшыя мясціны не бачылі рыцараў.

Традыцыйна запрашала наведнікаў літаратурная гасцёўня, арганізаваная бібліятэкай глушанскага Дома культуры. Без яе ніяк, бо Глушу нельга ўявіць без Алеся Адамовіча і яго творчасці. А яго дачка Наталля — нязменны госць «Глушанскага падворка». Яна і зараз прыехала, павіталася з глушанцамі, прайшлася па гандлёвых радах, затрымалася каля бібліятэчнага стэнда з творчасцю бацькі.

А яшчэ Глуша славіцца сваімі керамічнымі вырабамі і ўзорным дзіцячым калектывам «Глечыкі», дзе хлопчыкі і дзяўчат спасцігаюць сакрэты ганчарнага майстэрства пад кіраўніцтвам народнага майстра Беларусі Аляксандра Арлова. Разам са сваім калегамі братамі Боўдамі ён падводзіў вынікі традыцыйнага для фестывалю пленэра па кераміцы і ганчарстве.

Прыхільнікі народнай песні зноў зарадзіліся добрым настроем ад блізкіх сэрцу і душы спеваў. У Глушы жывуць нядрэнныя артысты, да іх на свята з прыемнасцю далучаюцца калектывы з дамоў культуры і сельскіх клубаў Бабруйскага, а на гэты раз і Асіповіцкага раёнаў. Удзельнікаў становіцца з кожным годам усё больш, бо такога адданага слухача, як у Глушы, які ведае на памяць амаль увесь іх рэпертуар, нідзе болей не знойдзеш.

Прылаўкі хлебасольнага хутарка кожны год ломяцца ад адборных сартоў садавіны і гародніны. Сёлетні фестываль не стаў выключэннем. Акрамя гэтага, тутэйшыя гаспадыні гатуюць для гасцей смачныя стравы па рэцэптах сваіх матуль і бабуль. Прыехаць у Глушу і не пакаштаваць смачнай юшкі ад гаспадарой аграсядзібы «Ціхі вір» — усё роўна што наогул не пабыць на свяце. Аматарам чагосьці мацнейшага тут прапануюць фірменную медавуху. Цікава, што ўсе тосты на «хутарку» гучаць аднолькава — «За Глушу!»

Колькасць прыхільнікаў свята пастаянна расце. Гэта месца валодае нейкай магічнай прыцягальнасцю. Калісьці тут збіраліся адкрыць этнацэнтр, зрабіць сапраўдную вёску канца XIX — пачатку XX стагоддзя... Але распаўся Савецкі Саюз, а ідэю так і не рэалізавалі. Цяпер жыццё ў «вёсцы» падтрымлівае тутэйшы кераміст Аляксандр Арлоў са сваім калектывам «Глечыкі» і вось гэты прыгожы фестываль.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

*zigulya@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

6 КАСТРЫЧНІКА 2016 г.
ЧАЦВЕР
№ 18 (15802)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

*Маладыя імёны*

**Аляксандр МІНЁНАК:**

# «Мару стаць сапраўдным артыстам»

**Саша ўжо паспеў усім даказаць, што ён лепшы. Аляксандр Мінёнак будзе прадстаўляць Беларусь на дзіцячым «Еўрабачанні», якое пройдзе 20 лістапада ў Валеце, сталіцы Мальты. Нягледзячы на падрыхтоўку да конкурсу, юны артыст выступае на ўсемагчымых канцэртах і бярэ ўдзел у іншых творчых мерапрыемствах. Часу ў яго амаль няма, аднак ён знайшоў магчымасць пагутарыць падчас свайго прыезду ў Дзяржынск.**

***— Раскажы пра песню, з якой будзеш выступаць на «Еўрабачанні»?***

— Кампазіцыя называецца «Музыка маіх перамог», я напісаў яе разам з Кірылам Ермаком. Яна цалкам пра мяне, бо я заўсёды імкнуўся падымацца вышэй і вышэй...

***— І якія мэты ставіш перад сабой?***

— Галоўная — гэта перамога на «Еўрабачанні». Насамрэч я буду моцна рады, калі ўвайду ў тройку пераможцаў. Гэта ўжо будзе для мяне перамогай. Другая мэта — выступіць на дзіцячай «Новай хвалі».

***— Калі даведаўся пра перамогу ў фінале адбору, якія былі эмоцыі?***

— Для пачатку магу расказаць, што адчуваў, калі даведаўся, што прайшоў на адборачны тур. Я быў вельмі шчаслівы. Гэта было ў мой дзень нараджэння, 25 ліпеня. Я не мог паверыць, гэта было сапраўдным шокам. Я быў шалёна задаволены і ў той жа час здзіўлены. Што тычыцца маёй перамогі, я і не спадзяваўся. Стаяў і шчыра радаваўся за Олю, калі галасавалі гледачы. Вельмі хваляваўся, але ўсё адно ўсміхаўся і апладзіраваў. А калі зразумеў, што перамог, не мог апамятацца ад радасці.

***— Саша, не баішся «зорнай хваробы»?***

— Цяпер у мяне яе няма і, спадзяюся, ніколі не будзе. А калі і здарыцца так, то побач са мной ёсць блізкія людзі, якія дапамогуць з ёй справіцца.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*



Фота БЕЛТА.

*Выпрабавана на сабе*

# ВОСЕМ ГАДЗІН ФІТНЕСУ... З АНУЧАЙ,

## ці Як я была клінерам

**Жыць у чыстых пакоях і пры гэтым не дакранацца да мятлы або пыласоса — ці ж гэта не мара! Клінінгавыя кампаніі прапануюць зрабіць прыборку любой складанасці хутка, якасна, з экалагічнабяспечнымі мыйнымі сродкамі. Як кажуць, любы капрыз за вашы грошы — гаспадар пакідае работнікам ключы, сам сыходзіць па справах, а вечарам вяртаецца і правярае якасць паслугі. Я вырашыла на дзень стаць прафесійнай прыбіральшчыцай і ўласнаручна адчуць, наколькі «пыльная» работа ў клінера.**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

### БЕЗ СНУ І ВЫХАДНЫХ

На работу майстры чысціні ходзяць звычайна па двое — так і хутчэй, і весялей. Мне чамусьці (няйначай спрацаваў стэрэатып «прыборка — жаночая справа») будучыя калегі ўяўляліся дзяўчатамі ў хусцінках і гумавых пальчатках. Таму, калі дзверы ў кватэру адчынілі два хлопцы, кожны з якіх вышэйшы за мяне на галаву, я, мякка кажучы, здзівілася. Яўген Лукашэвіч амаль адразу знік у суседнім пакоі — пайшоў «ваяваць» з брудам на балконе, а мы з Максімам Стрыгалёвым адправіліся наводзіць бляск на кухні.

Пакуль ішла па калідоры, разглядала будучы аб'ём работ. Кватэра пасля рамонту, але будаўнічага смецця нямнога, яно ўжо складзена ў кардонкі і чакае вынасу каля дзвярэй. Побач стаіць яшчэ адна, якую так і хочацца абазваць «наборам алхіміка». Ёмістасці з рознакаляровымі вадкасцямі, анучкамі, губкамі — відавочна, што да кожнай паверхні ў хлопцаў свой падыход. На недасведчаны погляд усёй працы гадзіны на чатыры.

Паслугі клінінгу, як кажа мой напарнік, будуюцца па прынцыпе «не зробіш ты — зробяць за цябе». Кліент можа заказаць прыбіранне вечарам альбо на выхадныя і патрабуе выканаць усё найхутчэй. Калі табе тэлефануюць увечары, а ты адказваеш толькі ранкам, лічы, заказ упушчаны. Самы пік работы падае на вясну і лета, калі будаўнікі здаюць дамы. Зімой попыт слабейшы. Можна працаваць тыдзень запар, а потым некалькі дзён не мець заказаў. З ацэнкай часу, дарэчы, я памылілася: «лёгкую» кватэру клінеры прыбіраюць каля 8 гадзін. Бывае, работа цягнецца 10—12 гадзін, а самы працяглы па часе заказ на прыбіранне гасцінічна-спартыўнага комплексу ў Мінску выконвалі 26 гадзін запар. Праўда, такія аўральныя сітуацыі здараюцца нячаста, навядзенне парадку ў моцна забруджаных памяшканнях прыбіральшчыкі звычайна размяркоўваюць на некалькі дзён. Нестабільны графік, стрэсавыя сітуацыі, цяжкая фізічная праца — не дзіўна, што клінінг, на думку Максіма, работа, хутчэй, для мужчын. «Затое, — жартуе хлопец, — пастаянны «фітнес» трымае ў форме».

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*

*Цікавы досвед*

# ШАХ І МАТ СТАРОЙ СІСТЭМЕ

## ЯК НАВЫКІ ГУЛЬНІ ДАПАМАГАЮЦЬ У ВУЧОБЕ І ЖЫЦЦІ

**«Настаўнік павінен стаць самым аўтарытэтным членам грамадства» — такую думку выказаў рэктар Армянскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта, доктар гістарычных навук, прафесар Рубен МІРЗАХАНЯН падчас свайго нядаўняга візіту ў Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт.**

**Супрацоўніцтва паміж гэтымі дзвюма ВНУ доўжыцца ўсяго два гады, тым не менш за адносна кароткі тэрмін былі арганізаваны ўжо дзве летнія школы па абмене студэнтамі плюс адбылося некалькі візітаў нашых выкладчыкаў і аспірантаў у Арменію.**

### «Можа, мы і фантазёры, але...»

— Мы неаднойчы дзяліліся з маім калегам досведам працы і сваім бачаннем перспектыў, — кажа Рубен Мірзаханян, маючы на ўвазе рэктара БДПУ, прафесара Аляксандра Жука. — Можа быць, мы з ім і фантазёры, але нам шчыра хочацца, каб у нашых выпускнікоў было пачуццё гонару і датычнасці да той важнай і высакароднай справы, якую мы разам робім. На наш погляд, трэба зрабіць усё, каб навучацца ў педагагічным універсітэце было адначасова і цікава, і прэстыжна. Каб у маладых людзей не было пачуцця няёмкасці ці сарамлівасці за зроблены выбар.

Арменію, як многія іншыя краіны, не абмінула мода на эканамічныя і юрыдычныя спецыяльнасці, але ў апошнія гады колькасць моладзі, якая паступае на іх, пакрысе змяншаецца: абітурыенты, ці, хутчэй за ўсё іх бацькі, пачалі задумвацца, а што будзе пасля заканчэння ўніверсітэта? Ці змогуць знайсці работу па атрыманай спецыяльнасці? Па словах Рубена Мірзаханяна, цяпер у Арменіі налічваецца 1450 школ (у савецкія часы іх было 1800). На жаль, колькасць вучняў змяншаецца, тым не менш попыт на настаўнікаў ёсць і будзе заўсёды, упэўнены ён. Аднак над іміджам педагога ў грамадстве яшчэ трэба сур'ёзна працаваць...

— Калі наш універсітэт наведвала міністр адукацыі Фінляндыі, яе суправаджаў вельмі імпазантны, падобны на кіназорку, гаваркі малады чалавек. Мой калега не ўтрымаўся і пацікавіўся, як яму ўдалося стаць памочнікам міністра адукацыі? — расказаў Рубен Мірзаханян. — Яго адказ, прызнаюся, нас шакіраваў. «Не змог здаць экзамен на настаўніка, — сказаў той і дабавіў, — зараз рыхтуюся, і калі не ў гэтым, то ў наступным годзе, спадзяюся, я яго здам, бо пакуль зарабляю ўдвая менш». І вось тут мы зразумелі ўсю сур'ёзнасць нашай сітуацыі.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*


Аляксандр Жук уручыў Рубену Мірзаханяну дыплом ганаровага прафесара БДПУ і прафесарскую мантыю.

Добры пачын

## Найлепшая практыка для будучых спецыялістаў

**Студэнты-лесаводы аднаўляюць угоддзі**

**Студэнты Беларускага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта пачалі «працоўны семестр» на аднаўленні пашкоджаных ураганамі лясоў.**

Як расказалі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі, 60 студэнтаў чацвёртага курса лесагаспадарчага факультэта і больш за 40 другакурснікаў факультэта тэхналогіі і тэхнікі лясной прамысловасці БДТУ прыступілі да пасадак лесу ў лясгасах, што найбольш пацярпелі ад ліпеньскіх ураганаў — Смалявіцкім, Чэрвеньскім і Бараўлянскім. Ужо за першы дзень работы будучыя спецыялісты лясной гаспадаркі пасадзілі амаль 10 гектараў новых насаджэнняў. «Працоўны семестр» будзе доўжыцца ў іх паўтара месяца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

Погляд на прафесію

# ЦІ ПАТРЭБНЫ ШКОЛЕ БУДУЧАГА НАСТАЎНІК?



**Дэбаты па педагагічнай футуралогіі «Школа заўтрашняга дня» прайшлі ў рамках сёмага этапу Фестывалю маладзёжнай універсітэцкай навукі ў БДПУ.**

Іх удзельнікамі сталі навучэнцы педагагічных класаў сталічнай гімназіі № 20 — тыя, хто праз колькі гадоў самі прыйдуць працаваць у школу. Камандам «У дэбатах толькі дзяўчаты» (капітан — Анастасія Шыманская) і «Джала камара» (капітан — Максім Камароў) прапанавалі абмеркаваць пытанне, якое хвалюе сёння ўсіх: навукоўцаў, педагогаў-практыкаў і бацькоў — «Ці патрэбны школе будучага настаўнік?»

Для доказу сваёй пазіцыі каманды прывялі сістэму навуковых канцэпцый, фактаў, гіпотэз, прагнозаў, аргументаў і контраргументаў. У прыватнасці, удзельнікі дэбатаў прыйшлі да высновы, што школа будучыні павінна стаць месцам, дзе навучэнцы змогуць атрымаць веды самымі рознымі спосабамі: самастойна, праз кансультацыі з настаўнікам або пры дапамозе інфармацыйных тэхналогій. Настаўнік у школе будучага, хутчэй за ўсё, застанецца, аднак кардынальным чынам зменяцца яго функцыі. У ходзе дэбатаў хлопцы і дзяўчаты змаглі стварыць розныя мадэлі развіцця школы. Сёння цяжка адназначна сказаць, якая з іх рэалізуецца ў будучыні. Але з упэўненасцю можна сказаць адно: калі ў школу прыйдуць выпускнікі педагагічных класаў — у ёй усё будзе добра!

Госці і балельшчыкі, якія прысутнічалі ў зале — навучэнцы педагагічных класаў, студэнты, магістранты, аспіранты, маладыя выкладчыкі — таксама актыўна ўключыліся ў дыскусію «Свабодны мікрафон».

У ролі экспертаў выступалі супрацоўнікі розных структурных падраздзяленняў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта: Цэнтра развіцця педагагічнай адукацыі, Інстытута псіхалогіі і факультэта сацыяльна-педагагічных тэхналогій універсітэта. Падводзячы вынікі, яны адзначылі высокі ўзровень падрыхтоўкі ўсіх удзельнікаў дыскусіі, лагічнасць і доказнасць меркаванняў каманды «У дэбатах толькі дзяўчаты», а таксама эмацыянальнасць, пераканаўчасць і дасціпнасць удзельнікаў каманды «Джала камара».

Кандыдат педагагічных навук, дацэнт, начальнік Цэнтра развіцця педагагічнай адукацыі БДПУ Аляксандра Пазняк падкрэсліла актуальнасць і складанасць заяўленай праблемы. Улічваючы, што ў 2016/2017 навучальным годзе колькасць педагагічных класаў у краіне павялічылася ўтрая (сёння ў 342 педагагічных класах і групах навучаюцца ўжо больш як 3,5 тысячы навучэнцаў), Аляксандра Валянцінаўна прапанавала прадоўжыць абмеркаванне тэмы на рэспубліканскім узроўні і абвясціла конкурс праектаў для навучэнцаў педагагічных класаў «Будучыя педагогі — пра школу будучыні».

Фестываль маладзёжнай навукі — унікальны праект, які стартаваў у бягучым годзе па ініцыятыве Міністэрства адукацыі і які рэалізоўваецца на пляцоўках розных ВНУ краіны. У рамках Рэспубліканскага кірмашу інавацыйных праектаў студэнтаў і маладых навукоўцаў у сацыяльна-адукацыйнай сферы ў БДПУ былі прадстаўлены 18 лепшых праектаў БДПУ і іншых ВНУ краіны. У рабоце кірмашу прынялі ўдзел таксама прадстаўнікі Біржы сацыяльных праектаў, грамадскае аб'яднанне «Сонечны круг», ТАА «Інвестыцыйны клуб», сацыяльна-інавацыйная платформа «Talaka.by» і індывідуальныя прадпрымальнікі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# ШАХ І МАТ СТАРОЙ СІСТЭМЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Арменія адной з першых краін на постсавецкай прасторы яшчэ ў 2005 годзе ўвайшла ў Балонскі працэс.

— Вас цікавіць наша стаўленне да гэтага? Скажу так: прамое капіраванне любых рэчаў невыканальнае і нават гратэскнае. У Балонскім працэсе ёсць шмат станоўчых момантаў, але вось, напрыклад, пераход выключна на пісьмовую форму экзаменаў я лічу няправільным. Пацвярджэнне сваім думкам знайшоў зноў-такі ў Фінляндыі. Там заўважылі, што нават у перадавых школах для вучняў стала сапраўднай праблемай вусна выкладаць свае думкі, таму задумаліся пра вяртанне вуснай формы кантролю ведаў.

Вядома, што ў многіх краінах Заходняй Еўропы педагагічная адукацыя даецца ў класічных універсітэтах толькі на ўзроўні магістратуры. У Фінляндыі педагагічныя дысцыпліны выкладаюцца на апошнім курсе бакалаўрыята. Але незалежна ад таго, далучылася краіна да Балонскага працэсу ці не, мы павінны прытрымлівацца асабліваснаў і традыцый нашай адукацыйнай сістэмы. З Балонскага працэсу трэба браць усё самае перадавое і ўкараняць яго, але разам з тым нельга страчваць сваю нацыянальную ідэнтычнасць.




**Аляксандр Жук і Рубен Мірзаханян: «Будзем рабіць усё, каб навучацца ў педагагічным універсітэце было прэстыжна».**

**Сапраўдным эксклюзівам армянскай школы можна лічыць абавязковае выкладанне ў пачатковай школе шахмат. Гэта нацыянальны адукацыйны прадукт, створаны разам з Шахматнай акадэміяй.**

Вышэйшая школа ў Арменіі — трохступенчатая: навучанне ў бакалаўрыяце доўжыцца ад трох да чатырох гадоў (пераважна чатыры), у магістратуры — адзін—два гады (пераважна — два) і тры гады — у аспірантуры. У вышэйшай школе ўведзена сістэма назапашвання крэдытаў і трансферу крэдытаў, вучэбныя праграмы пераарыентаваныя на модульнасць. Пасля ўступлення ў Балонскі працэс пашырылася аўтаномія студэнтаў і іх удзел у працэсе прыняцця рашэнняў на ўзроўні ВНУ .

### Канкурэнцыя як стымул

У 90-я гады і на мяжы стагоддзяў у Арменіі налічвалася 90 (!) прыватных ВНУ. Натуральна, што было шмат прэтэнзій да якасці адукацыі, якую там давалі... Сёння ў Арменіі працуюць 26 дзяржаўных універсітэтаў і 40 прыватных. Сярод іх ёсць і Амерыканскі ўніверсітэт. «Гэта вельмі магутная навучальная ўстанова, з сур'ёзнай падтрымкай з боку грамадскіх арганізацый і фантастычнымі акладамі ў выкладчыкаў, якая выдае дыпломы амерыканскага ўзору. Выкладанне там вядзецца выключна на англійскай мове. Мае калегі часта скардзяцца, маўляў, у іх магчымасці зусім іншыя, а я звычайна ім кажу: гэта добра, калі ў краіне ёсць магутны ўніверсітэт. Тым больш што мы запрашалі яго спецыялістаў і да сябе. А яны не могуць дрэнна выконваць сваю работу», — кажа Рубен Мірзаханян.

У Арменіі дзейнічаюць таксама Французскі інжынерны інстытут, які выдае дыпломы армянскага і французскага ўзораў, Славянскі ўніверсітэт (расійска-армянская навучальная ўстанова). Нядаўна свой філіял адкрыў Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт.

— Мяркую, што наяўнасць мабільных, цікавых і змястоўных устаноў вышэйшай адукацыі моцна стымулюе канкурэнцыю. Трэба з імі супрацоўнічаць і разам рухацца наперад, — падкрэслівае рэктар Армянскага педагагічнага ўніверсітэта. — Пасля іх з'яўлення ў краіне колькасць студэнтаў у нас не зменшылася, таму мы з аптымізмам глядзім наперад.

Дарэчы, вышэйшая адукацыя ў Арменіі пераважна платная. На бюджэтнай форме навучання ў рамках дзяржаўнага заказу навучаюцца толькі 13—14% студэнтаў ад агульнай колькасці. Зразумела, што і практыкі размеркавання там няма. Выпускнікі ВНУ вымушаны самастойна шукаць сабе месца работы. У Армянскім педагагічным універсітэце заўважылі адну цікавую тэндэнцыю: кіраўнікі прыватных школ, якіх у краіне значна менш, але навучанне ў іх каштуе вельмі дорага — да 10 тысяч долараў у год, прыходзяць на выпускныя экзамены, выбіраюць і запрашаюць да сябе лепшых, а вось дзяржаўныя школы такое не практыкуюць. Міністэрства абароны запрашае да сябе псіхолагаў, і нават Ерэванскі ювелірны завод знаходзіць для сябе кадры ў педагагічным універсітэце.

### Выхаванне супернастаўнікаў

Рубен Мірзаханян упэўнены, што краевугольным каменем у падрыхтоўцы будучых педагогаў з'яўляецца арганізацыя педагагічнай практыкі.

— Не сакрэт, што далёка не ўсе нашы супервыдатнікі становяцца супернастаўнікамі ці нават проста добрымі настаўнікамі. А з тых, хто, можа, і не паказваў бліскучыя вынікі ў вучобе, вырастаюць выдатныя педагогі. Настаўніцтва — гэта мастацтва, уменне любіць вучня і дзяліцца з ім сваімі ведамі, — падкрэслівае ён. — Часткова такія здольнасці даюцца прыродай, а часткова гэтаму можна навучыць. Традыцыі праходжання педагагічнай практыкі, якія засталіся з савецкіх часоў, былі далёка не лепшыя. Працадаўцы і школы заўсёды ставіліся да яе фармальна, адмахваліся ад нашых студэнтаў, маўляў, давай я табе хутчэй усё падпішу. Таму мы кардынальна змянілі падыходы да педагагічнай практыкі. Раней базай для яе былі аж 200 школ, апошнім часам іх колькасць зменшылася да 40, а цяпер мы звузілі базу да 15 школ. Прычым сярод іх ёсць і чатыры прыватныя школы. Лепш тую суму, што мы пералічваем за практыку, размеркаваць паміж меншай колькасцю ўстаноў адукацыі, але папрасіць паставіцца да нашых студэнтаў максімальна сур'ёзна і замацаваць за імі лепшых педагогаў. Фінансы, лічу, добры матыватар для школ.

Педпрактыка цяпер распачынаецца з другога курса, а колькасць гадзін на яе павялічылася ў пяць разоў. Асобнага выпускнога экзамену па педагогіцы на выхадзе няма, затое сумарная ацэнка за практыку ўлічваецца ў выніковай атэстацыйнай ацэнцы. А гэта цягне перагляд падыходаў да стварэння партфолія па педпрактыцы.

— Канешне, ведаць, калі нарадзіўся той ці іншы педагог, якія ў яго былі погляды і чым ён праславіўся, важна, але куды больш важнае ўменне весці ўрок, устанаўліваць кантакт з аўдыторыяй, знаходзіць агульную мову з вучнямі, — кажа Рубен Мірзаханян.

**«Не змог здаць экзамен на настаўніка. Зараз рыхтуюся, спадзяюся здам, бо пакуль зарабляю ўдвая менш».**

Сапраўдным эксклюзівам армянскай школы можна лічыць абавязковае выкладанне ў пачатковай школе шахмат. Гэта нацыянальны адукацыйны прадукт, створаны разам з Шахматнай акадэміяй. У Армянскім педагагічным універсітэце створана кафедра шахмат і спорту і дзейнічае навукова-даследчая лабараторыя, дзе вывучаюць феномен выкладання шахмат у школе. Напрыклад, удалося даказаць, што вывучэнне шахматнай гульні стымулюе ў дзяцей крэатыўнасць, лагічнае мысленне, стратэгічнае планаванне, спрыяе фарміраванню асобы, якая ведае, што такое перамога і што такое паражэнне. Лідарскія якасці, якія фарміруюцца ў дзяцей, уменне несці адказнасць за свае рашэнні спатрэбяцца ім не толькі ў шахматах, але і ў вучобе, і ў далейшым жыцці. Да таго ж праз вывучэнне шахмат удалося дабіцца паляпшэння паспяховасці і па іншых прадметах, у тым ліку па матэматыцы.

— Мала самому ўмець гуляць у шахматы, трэба яшчэ і навучыць гэтаму дзяцей. Многія выкладчыкі матэматыкі, фізікі і нават гісторыі імкнуцца атрымаць ліцэнзію на выкладанне шахмат у пачатковай школе, каб такім чынам павялічыць сваю нагрузку, — дадаў Рубен Мірзаханян.

На пытанне, ці лічыцца педагогіка ў Арменіі жаночай прафесіяй, рэктар Армянскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта з сумам канстатаваў: «90 працэнтаў нашых студэнтаў — гэта дзяўчаты. І нават на фізіка-матэматычным факультэце дзяўчат ужо большасць».

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ
БРСМ СКАРБОНКА ДОБРЫХ СПРАЎ ЧЫРВОНКА

## НЕ ПАКІНУЦЬ З ПРАБЛЕМАМІ САМ-НАСАМ

**У краіне праходзіць штогадовая рэспубліканская дабрачынная акцыя «Мы выбіраем дапамогу пажылым людзям», якую традыцыйна ладзіць Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. Сёлета яна будзе доўжыцца да 13 кастрычніка, падчас акцыі па ўсёй краіне адбудуцца больш за 200 розных мерапрыемстваў.**

Валанцёрскія атрады БРСМ «Добрае Сэрца» наведваюць адзінокіх і адзінока пражываючых грамадзян пажылога ўзросту, ветэранаў вайны і працы, дапамагаюць ім у навядзенні парадку і прыбіранні дамоў і прысядзібных тэрыторый. Галоўная мэта акцыі «Мы выбіраем дапамогу пажылым людзям» — пераемнасць пакаленняў праз прыцягненне ўвагі моладзі да праблем людзей сталага веку. Прычым валанцёры паспяваюць прыйсці на дапамогу не толькі ім. Вось некалькі такіх прыкладаў.

Валанцёрскі атрад Смалявіцкай раённай гімназіі арганізаваў акцыю «Незабудка». Яго члены — а гэта 15 падлеткаў — наведалі пенсіянераў, ветэранаў, адзінока пражываючых у прыватных дамах і аказалі ім дапамогу ў прыбіранні ўчасткаў, зборы яблыкаў, навядзенні парадку ў жыллі. А найбліжэйшым часам, як расказала педагог-арганізатар гімназіі Ганна Яўсеева, члены атрада збіраюцца наведаць сацыяльна-педагагічны цэнтр, для выхаванцаў якога сабралі патрэбныя рэчы.

Навучэнцы Чэрвеньскага прафесійнага будаўнічага ліцэя Ігар Капусцін, Кірыл Ромаш, Андрэй Міронічак дапамаглі ў прыбіранні тэрыторыі і зборы яблыкаў 94-гадоваму ветэрану Вялікай Айчыннай вайны. Як расказаў першы сакратар Чэрвеньскага райкама БРСМ Вячаслаў Клімовіч, у дзень нашага звароту ўжо іншыя валанцёры ўскапалі градкі 93-гадовай бабулі. А валанцёры Дзмітрый Сановіч, Марыя Гільніч наведалі Смілавіцкі сацыяльна-педагагічны цэнтр і перадалі выхаванцам канцылярскія прыналежнасці.

Міхаіл Шалапо, вучань 11 класа мядзельскай гімназіі-інтэрната, у вольны час арганізаваў іншых валанцёраў, і яны кампаніяй прыбралі на брацкай магіле загінулых у вайну салдатаў і партызан. Такая акцыя праходзіць штогод, але Міша вырашыў зладзіць яе сёлета раней звычайнага.

У аграгарадку Хожава Маладзечанскага раёна валанцёры не толькі дапамаглі адзінокаму чалавеку прыбраць прысядзібную тэрыторыю, але і пасклаdвалі дровы з брыкетам. Добрых спраў шмат не бывае! Далучайцеся!

## ДАПАМАГЛІ МАНАСТЫРАМ І ХРАМАМ

**Учора ў Фаніпалі падвялі вынікі рэспубліканскай дабрачыннай акцыі БРСМ «Аднаўленне святынь Беларусі» на тэрыторыі Міншчыны. Перад тым рэгіянальныя этапы прайшлі ва ўсіх раёнах прысталічнай вобласці. Так, сёлета дзякуючы валанцёрам руху «Добрае Сэрца» на Міншчыне набылі абноўлены выгляд больш за паўсотні культавых аб'ектаў.**

Яркім дадаткам да мерапрыемства стала прэзентацыя фотакарты добраўпарадкаваных святынь вобласці, якая была ўпершыню прэзентавана ў 2014 годзе. Праект з'яўляецца ўнікальным, а цяпер яшчэ і традыцыйным для маладзёжнай арганізацыі. Адзін погляд на фотакарту адразу дапаможа ў вызначэнні маршруту па наведванні святых месцаў і культавых аб'ектаў Мінскай вобласці.

За некалькі дзён да таго валанцёры руху «Добрае Сэрца» падвялі вынікі гэтай жа акцыі на сталічным узроўні. З сакавіка па кастрычнік бягучага года яе ўдзельнікі аказалі садзейнічанне 25 культавым аб'ектам Мінска, прысталічнага раёна і Мінскай вобласці. Усяго ў акцыі прынялі ўдзел больш за 300 сталічных валанцёраў, якія займаліся зборам ураджаю ў садах манастыроў, рознымі будаўнічымі работамі (дэмантажом перакрыццяў, прыборкай будаўнічага смецця і інш.), добраўпарадкаваннем тэрыторыі: акультураннем тратуарнай пліткай, пакосам і прыбіраннем травы, апалай лістоты, прыбіраннем памяшканняў храмаў.

Рэспубліканская дабрачынная акцыя «Аднаўленне святынь Беларусі» ўпершыню стартавала ў 2014 годзе і з тых часоў па ўсёй краіне была аказана дапамога ў добраўпарадкаванні соцень святынь. Яна рэалізуецца з мэтай выхавання і развіцця ў падрастаючага пакалення духоўна-маральных каштоўнасцяў, заснаваных на традыцыях беларускага народа.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by



З Наталляй Лубнеўскай

## МОРКВА ДЛЯ НАСТРОЮ

**Восеньскія халады толькі пачаліся, а ў інтэрнэце ўжо жартуюць, што час пераходзіць у «жрущий лежим» і апранацца ў касцюм новага супергероя — чалавека-гародніны. Ці не жартуюць? Па статыстыцы Міжнароднай асацыяцыі фітнесу, восенню і ўзімку мы займаемся спортам на 60 працэнтаў менш, чым вясной і летам. Калі на двары дажджы, усе вечары хочацца праводзіць аднолькава — з гарачым баршчом і гарбатай з бутэрбродам. І няхай увесь свет пачакае, бо пад пухавіком лішніх (ці запасных?) кілаграмаў усё роўна не будзе відаць.**

Я, праўда, у школьныя гады, наадварот, папраўлялася ўлетку. Бо амаль усе тры месяцы праводзіла ў вёсцы ў бабулі, якая старалася карміць унукаў да адвалу. Батон з варэннем і малаком, зацірка, свая каўбаса, мучныя бліны са смятанай... Супраціўляцца было немагчыма. Таму пасля летніх канікул я прывозіла загар і ўкормленыя шчокі.

Дыетолагі кажуць, што восенню і зімой насамрэч складаней худзець, чым летам (але складана — не значыць немагчыма!). І раяць прыслухацца да свайго арганізма. Не ў сэнсе залегчы на канапу, пакуль не пацяплее. А выбіраць тыя прадукты, якія дапамогуць вам сагрэцца і надоўга запасціся энергіяй.

Напрыклад, есці тлустую рыбу, мяса птушкі, арэхі, стравы, прыпраўленыя алеем. Цёплыя супы: яны, па-першае, сытныя, а па-другое, менш каларыйныя (пры ўмове, што вы не дабаўляеце туды смятану і смажанку). Бульбу і квашаную капусту таксама варта ўключыць у рацыён. Асновай, як і ў цёплы час, павінны быць агародніна і садавіна. А заставацца сытым як мага даўжэй дапамогуць прадукты з клятчаткай (бабовыя, вотруб'е, арэхі, яблыкі, бананы).

У халады арганізму патрэбны тлушчы і вугляводы, таму лепш адмовіцца ад жорсткіх дыет. Восеньскі пануры настрой уздымайце не шакаладам і піражнымі, а прагулкамі на свежым паветры. Ці аранжавымі фруктамі і агароднінай. Замест салодкага можна выбраць гарбату з апетытным водарам і смакам. А каб папярэдзіць павышаны апетыт, лепш цёпла апранацца ці прымаць гарачую ванну.

Запісацца на фітнес менавіта ў гэту пару года ў многіх ёсць прычына. Калі вясной хочуць пахудзець да адпачынку, то восенню — пасля яго. «Шведскія сталы», ведаеце, робяць сваю справу. Памятаю, адна мая кліентка радавалася, што пасля некалькіх месяцаў трэніровак нарэшце змагла надзець сваю любімую спадніцу. А потым два тыдні на курорце — і бывай, падцягнуты жывот. Быццам і не займалася дагэтуль.

Трэніроўкі ў халодны час года павінны адрозніваца ад летніх заняткаў. Упор лепш рабіць не на спальванне тлушчу, а на нарошчванне мышцаў. Восень і зіма ідэальна для гэтага падыходзяць. Аддавайце перавагу сілавым трэніроўкам і не хваліцеся за фігуру: для падтрымання мышачнай масы арганізм расходуе шмат энергіі, а таму папраўляцца вы не будзеце. Пра бонусы ў выглядзе добрага настрою і павышанай працаздольнасці ўжо маўчу.

Калі летам вы адпачывалі ад трэнажоркі, то вяртацца ў строй трэба паступова — пачынаць з заняткаў напалову менш інтэнсіўных, чым былі раней. Праз два-тры тыдні можна пераключыцца на звычайны рэжым.

Дагэтуль займаліся на двары і ў залу не цягне? Халоднае надвор'е не нагода спыняць трэніроўкі: пакуль дачакаецеся цеплыні, адвыкнеце ад фізічнай нагрузкі. Трэба толькі правільна апранацца. Экіпіроўка павінна быць шматслойнай. Ніжні слой — тэрмабялізна, сярэдні — трыкатажныя рэчы для саграванне цела (напрыклад, з флісу), верхні — куртка з воданепранікальнай тканіны, каб абараніць ад ветру і дажджу. Не апранайцеся занадта цёпла, быццам збіраецеся на звычайны шпацыр. Інакш будзе цяжка займацца.

...Дапісваю гэтыя радкі ў халодным кабінеце і думаю, ці не прагуляць мне сённяшні басейн. Але побач стаіць вялікая торба з ручніком, фенам і сланцамі: не дарма ж насіла яе ўвесь дзень. (Дарэчы, гэта яшчэ адзін хітрык, каб не прапускаць трэніроўкі.) Трэба ісці, без варыянтаў.

*Пра сур'ёзнае — папулярна*

# ГЕНЕТЫКА Ў КУБІКАХ І «БРАНЯ» ДЛЯ СЭРЦА

## Навошта навукоўцы выйшлі на «рынг»?

**Як думаеце, колькі часу звычайна трацяць фармаколагі на распрацоўку лекавых прэпаратаў? Статыстыка сцвярджае, што работа над новай таблеткай у сярэднім доўжыцца ад пяці да шаснаццаці гадоў. І гэта не кажучы пра фінансавыя выдаткі, якія часам дасягаюць мільярдаў долараў. Але навуковы супрацоўнік лабараторыі бялковай інжынерыі Інстытута біяарганічнай хіміі Нацыянальнай акадэміі навук Юрый КАРНАВУШАНКА сцвярджае, што пры дапамозе сучасных камп'ютараў гэтыя тэрміны і выдаткі можна зменшыць у дзясяткі, калі не сотні разоў. Пра сваю распрацоўку даследчык расказаў шырокай публіцы падчас «Навуковага рынгу» — мерапрыемства, дзе вучоныя тлумачылі сутнасць сваіх праектаў пры дапамозе падручных сродкаў. Спаборніцтвы ў такім фармаце праходзілі ў краіне ўпершыню, іх арганізатарамі выступілі Савет маладых вучоных НАН, Цэнтральная навуковая бібліятэка НАН, кампанія EPAM Systems, EPAM-Гараж і Парк высокіх тэхналогій.**

Што ж прапануе Юрый Карнавушанка? Па яго словах, найбольш часу ў вынаходнікаў лекаў займае праверка заведама памылковых варыянтаў прэпарату, якіх можа быць дзясяткі тысяч. Дзеянне рэчываў звычайна выпрабоўваецца на жывых клетках, а гэта выдаткі на матэрыялы і тысячы марна патрачаных гадзін. Але калі перанесці эксперыменты з рэальнага свету ў віртуальны, суперкамп'ютар зможа зрабіць тую самую працу за лічаныя гадзіны. Менавіта пры дапамозе камп'ютарнага мадэлявання беларускія навукоўцы цяпер ствараюць прэпарат, які можа перамагчы ВІЧ. Сутнасць распрацоўкі Юрый тлумачыў пры дапамозе двух гумавых шарыкаў: вялікі чырвоны імітаваў клетку чалавечага арганізма, а шэры з шыпамі — вірус імунадэфіцыта.

**Навуковы супрацоўнік Інстытута агульнай і неарганічнай хіміі Нацыянальнай акадэміі навук Сяргей БЕСАРАБ** прадставіў на «рынгу» сваю альтэрнатыву аперацыйнаму ўмяшанню пры сардэчна-сасудзістых захворваннях. Праца, безумоўна, актуальная — менавіта хваробы сэрца і крывяноснай сістэмы ўпэўнена ўтрымліваюць першае месца ў структуры смяротнасці насельніцтва ў Беларусі і многіх іншых краінах. Клінічную карціну хваробы навуковец растлумачыў пры дапамозе магнітнай дошкі з малюнкамі.

Часта інфаркт патрабуе аперацыйнага ўмяшання. Зразумела, якіх грошай гэта можа каштаваць. Але ў Інстытуце агульнай і неарганічнай хіміі распрацавалі спецыяльны кардыягідрагель. Рэчыва называюць «бранёй для сэрца» — трапляючы ў арганізм пацыента, вадкі састаў пад уздзеяннем тэмпературы цела і іншых фактараў пачынае зацвярдзяваць і становіцца замяшчальнікам пашкоджаных інфарктам тканак. Адзінае патрабаванне — укол гідрагеля трэба зрабіць максімальна апратыўна, пакуль рана не пачала рубцавацца. Цяпер праект знаходзіцца на дапрацоўцы — эксперыменты паказалі, што «як трэба» ён спрацоўвае толькі ў 80 працэнтах выпадкаў, а для ўкаранення ў медыцынскую практыку гэтага мала — патрэбна абсалютная лічба.

Даследаванне **малодшага навуковага супрацоўніка лабараторыі нехрамасомнай спадчыннасці Інстытута генетыкі і цыталогіі Нацыянальнай акадэміі навук Максіма РОДЗЬКІНА** прысвечана гепатыту С — хваробе, на якую пакутуе каля аднаго працэнта насельніцтва Беларусі. Ад заражэння не застрахаваны практычна ніхто — усе мы карыстаемся паслугамі стаматолагаў, ходзім у касметычныя кабінеты, наведваем бальніцы... Спецыяльнае лячэнне каштуе шалёных грошай і спрацоўвае далёка не заўсёды. Навукоўцы высветлілі, што паспяховасць тэрапіі залежыць у першую чаргу ад генетычных асаблівасцяў кожнага чалавека. Вызначэнне канкрэтнага гена, які зніжае шанцы на выздараўленне, можа сэканоміць многім хворым грошы і, галоўнае, час.

Асаблівасці генетыкі Максім тлумачыў пры дапамозе кубікаў з літарамі. A, G, C, T — увесь геном чалавека зашыфраваны пры дапамозе ўсяго чатырох бялкоў: адэніна, гуаніна, цытазіна і тыміна, але іх парадак у структуры ДНК можа змяняць ключавыя характарыстыкі арганізма. Перастаўляючы ўсяго адзін кубік, Максім паказваў, як можа памяняцца вынік лячэння. Пры адным варыянце пацыент амаль дакладна ачуняе, пры другім — менш імаверна, пры трэцім — шанцаў на ачуньванне амаль няма.


Тлумачыць сутнасць распрацовак часам даводзілася літаральна на пальцах.


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.
Своечасовы ўкол кардыягідрагелю можа аблегчыць жыццё тысячам людзей.

***Рэгламент спаборніцтваў у фармаце science slam, які ўжо даўно і паспяхова культывуецца на Захадзе, просты: у кожнага выступоўцы ёсць дзесяць хвілін, каб максімальна змястоўна і даходліва расплумачыць прысутным сэнс таго, чым ён займаецца. Яшчэ пяць хвілін даюцца на пытанні аўдыторыі і адказы ўдзельніка. Пераможцы вызначаюцца галасаваннем публікі. Менавіта такі падыход дазваляе звязаць навуковую супольнасць з грамадскасцю і паказаць значнасць працы даследчыкаў.***

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

*Любоў ды лад*

# ПРАШУ РУКІ!



## Спосабы дабіцца згоды ад выбранніцы

**Пачуць слова «так» хоча кожны хлопец, які вырашыў зрабіць прапанову рукі і сэрца сваёй каханай. Мы пагутарылі з тымі, хто ўжо прайшоў гэты этап і зараз рыхтуецца да вяселля. Жаніхі згадваюць, як рабілі адзін з найважнейшых крокаў у жыцці, з якімі цяжкасцямі сутыкнуліся і за што хваляваліся больш за ўсё.**

### З ЗЯМЛІ ДА НЯБЁСАЎ

Каця і Саша пазнаёміліся на вяселлі сяброў. Пра ўласнае такое ж свята пара загаварыла праз тры гады. Але спачатку, зразумела, была прапанова. Тут хлопцу прыйшлося паламаць галаву, каб уразіць не вельмі рамантычную выбранніцу.

— Музыку, плюшавыя цацкі і цукеркі я адкінуў адразу. У паўсядзённым жыцці яна на іх нават не звяртае ўвагі, што ўжо казаць пра дзень «Х». Варыянт з дарагім рэстаранам і жывой музыкай таксама паказаўся мне простым, — успамінае жаніх. — Ідэя з верталётам прыйшла падчас ранішняй прабежкі. Рэалізаваць яе было нескладана, а вось хваляванні наконт таго, што нешта пойдзе не так, былі. Але ў верталётным клубе маю ідэю не проста падтрымалі, а адразу папрасілі выкарыстоўваць нашы фота для рэкламы новай паслугі «Прапанова рукі і сэрца ў небе».

Запаветнае пытанне, пакуль пара была ў небе, мелам выводзілі супрацоўнікі клуба. «Мастакі» загадзя размалявалі ўсю пляцоўку... загадзя размалявалі плошчу ўзлётнай паласы, каб надпіс атрымаўся прыгожым.



**«Вельмі хваляваўся, як маю задуму ўспрымуць звычайныя гледачы. Людзі ў кіно прыйшлі, а тут — «цырк».**

— Каці я сказаў, што мы ідзём на фотасесію (яна даўно хацела). Тая, нічога не падазраючы, надзела самую прыгожую сукенку і пазіравала перад фатографам (аб гэтым я таксама паклапаціўся). Ляталі мы паўгадзіны. За гэты час пілот паспеў расказаць нам з дзясятак гісторый пра Мінск, а мае далоні змакрэлі зусім. «Нешта памянялася ў нас тут», — указваючы на ўзлётную паласу, сказаў пілот. Каця нават вокам не павяла. Маўляў, навошта мне ваш асфальт, калі за акном неба! — дзеліцца жаніх.

Мужчына за штурвалам звярнуўся да «героіні свята» яшчэ раз. Тая зрабіла ласку — паглядзела ўніз. Апісваць ТАКІЯ эмоцыі я не ўмею. Калі проста: дзяўчына сказала «так».

### ТВАЯ РОЛЯ — ГАЛОЎНАЯ

Сяргей і Ганна — будучыя рэжысёры. Гадоў праз дзесяць мы будзем глядзець іх фільмы. Пакуль жа пара здымае кіно толькі для закрытага кола гледачоў. Але адна стужка ўсё-такі патрапіла на вялікі экран.

— У кінатэатр мы пайшлі на фільм, пра які Ганна прагаварыла мне ўсе вушы. Я ведаў, што прапусціць яго яна не зможа, і мне трэба гэтым карыстацца, — успамінае Сяргей.

**Запаветнае пытанне, пакуль пара была ў небе, мелам выводзілі супрацоўнікі клуба. «Мастакі» загадзя размалявалі плошчу ўзлётнай паласы, каб надпіс атрымаўся прыгожым.**

Хлопец каля месяца цішком здымаў каханую дома, ва універсітэце, на вуліцы, з сябрамі. Жаніх падключыў усіх родных дзяўчыны і тыя, трэба аддаць належнае, тайну зберагалі. Фільм агучваў і мантажаваў Сяргей сам. Сябры-аднагрупнікі дапамаглі толькі з тымі кадрамі, у якія трэба было ўвесці галоўнага героя-жаніха.

— Прэм'ера адбылася перад пачаткам той стужкі, на якую Ганна, уласна, і прыйшла. Разам з ёй «кіно» глядзела і ўся кіназала. Перад гэтым я сышоў быццам бы ў прыбіральню. За дзвярыма ветлівыя кантралёры ўжо чакалі мяне з загадзя падрыхтаваным букетам кветак. Дачакаўшыся патрэбнага моманту і запаленага святла, я зайшоў у залу — Ганна рыдала.

Далей — усё як у сапраўдным кіно. Але гэта ўжо другая «серыя».

— Вельмі хваляваўся, як маю задуму ўспрымуць звычайныя гледачы. Людзі ў кіно прыйшлі, а тут — «цырк», — дзеліцца Сяргей. — Але мне пашчасціла. Мужчыны ў зале падтрымлівалі поглядам, потым падыходзілі — руку ціснулі, а жанчыны, напэўна, усе слёзы выплакалі і далоні ад апладысментаў сцерлі.

Дарэчы, сёння таксама модна выкладваць міні-фільмы з прапановай рукі і сэрца на відэахостынгі або ў сацыяльныя сеткі. Жаніхі скідваюць спасылку сваёй выбранніцы і чакаюць рэакцыі, калі тая зразумее, што гаворка ідзе пра яе. Публічна прызнацца ў каханні можна і праз мясцовую радыёстанцыю. Галоўнае — ведаць момант, калі каханая будзе слухаць радыё.

### ПРАПАНОВА НА... УЗБОЧЫНЕ

Вадзім з дзяцінства марыў маляваць. Але знайшоў сябе хлопец у сферы IT-тэхналогій. Як і нявесту Марына і Вадзім працуюць разам ужо два гады.

— Чаму білборд? Для мяне ён нечым нагадвае карціну, а я заўсёды хацеў адчуць сябе мастаком. Спачатку была ідэя павесіць партрэт Марыны ў музеі ці галерэі, але ўсе мае спробы даказаць кіраўніцтву, што «гэта» таксама свайго роду мастацтва, праваліліся. Прыйшлося шукаць іншы варыянт, — успамінае Вадзім.

Праз тыдзень білборд з выявай каханай і словамі «Ты будзеш маёй жонкай?» ужо ўпрыгожваў адзін з участкаў дарогі ў напрамку Гомеля. Менавіта па дарозе да бацькоў Марына павінна была заўважыць незвычайную «рэкламу».

— Перад самым сюрпрызам у нас быццам бы зламалася машына. У гэтую версію Марына паверыла. Яна выйшла з салона і хвіліны дзве глядзела на білборд. «Або мы вельмі падобныя, або маё фота скралі. Я гэтага так проста не пакіну», — нечакана пачуў я. На момант я пачаў сумнявацца ў сваёй задуме.

Праз секунд трыццаць Марына раптам зазіхацела ўсмешкай і кінулася да Вадзіма. Хлопец ужо паспеў дастаць з кішэні пярсцёнак і стаць на калена. «Я згодная!»

**Праз тыдзень білборд з выявай каханай і словамі «Ты будзеш маёй жонкай?» ужо ўпрыгожваў адзін з участкаў дарогі ў напрамку Гомеля. Менавіта па дарозе да бацькоў Марына павінна была заўважыць незвычайную «рэкламу».**

— Колькі фотаздымкаў каля білборда было зроблена намі, бацькамі, сябрамі і проста падарожнымі — падлічыць цяжка. Але, ведаеце, ні адна камера не перадасць тых эмоцый, якія на ўсё жыццё адбіліся ў нашай памяці, — дадае Вадзім.

У канцы нашай размовы Вадзім расказаў пра ўсе тэхнічныя, матэрыяльныя і нават маральныя цяжкасці сваёй задумы. Але аўтару матэрыялу падалося, што гэта ўжо зусім іншая гісторыя. Бо гэты аповед пра натхненне, смеласць, фантазію, рызыку і, вядома, каханне!

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**
*asmykovich@zviazda.by*

*Свая атмасфера*

# РАМАНТЫКА ТАНЦАЎ У КЛУБЕ

## У вясковай моладзі да іх асаблівае стаўленне

**Пра вясковыя дыскатэкі існуе шмат міфаў, прыдумана нямала жартаў, і, як правіла, зроблена гэта тымі, хто быў там аднойчы або ўвогуле ніколі. Раз-пораз у сродках масавай інфармацыі з'яўляюцца рэпартажы з дамоў культуры, у якіх журналісты расказваюць пра «некультурны» адпачынак мясцовай моладзі. Такі аднабаковы погляд фарміруе няправільнае ўяўленне пра хлопцаў і дзяўчат, што жывуць у вёсцы.**

Сёння вясковая дыскатэка — з'ява даволі рэдкая. Яшчэ гадоў дзесяць таму моладзь у глыбінцы хадзіла на танцы ў ДК, бо проста не мела іншага спосабу правесці суботні вечар, а цяпер, калі хуткасны інтэрнэт ёсць у кожнага, можна нікуды не выбірацца. Тым не менш засталіся яшчэ тыя, хто выбірае дыскатэку замест амаль нерухомага сядзення перад маніторам камп'ютара. Я і сама зусім нядаўна належала да такіх: любіла завітаць у ДК, будучы старшакласніцай, а пазней студэнткай малодшых курсаў, калі прыязджала дадому ледзь не кожныя выхадныя.

Паколькі ў нашай вёсцы ў Лунінецкім раёне дыскатэка не праводзілася, мы з сяброўкамі хадзілі ў суседнюю. Дарога праз лес нас не палохала: заўсёды збіраліся кампаніяй і смела пераадольвалі некалькі кіламетраў уздоўж шашы. Ужо на падыходзе да Дома культуры пераабуваліся ў туфлі на абцасах — вялікую адлегласць ды яшчэ і па пяску ў іх не пройдзеш, а быць прыгожай хочацца! Гэта, дарэчы, і ёсць прычына, па якой дзяўчаты бяруць з сабой сумкі.

Афіцыйна дыскатэка пачынаецца а дзявятай вечара, але фактычна народ падцягваецца да ДК толькі аб адзінаццатай (гэта прытым, што заканчваецца ўсё ў гадзіну ночы). Адразу ў танцавальную залу ніхто не спяшаецца. Хлопцы і дзяўчаты з трох вёсак звычайна стаяць каля ўвахода, абмяркоўваюць апошнія навіны, хтосьці курыць. Спіртныя напоі на саму дыскатэку прыносяць рэдка: да ДК час ад часу пад'язджае міліцыя, а праблемы з ёй, вядома, нікому не патрэбны.

Павітаўшыся з усімі знаёмымі і набыўшы білет перад уваходам, можна ісці далей — у танцавальную залу. Для кагосьці яна падасца пуставатай: некалькі рознакаляровых ліхтарыкаў пад столлю і дыджэй крыху ўзвышаецца над пляцоўкай. Але, па сутнасці, больш нічога і не патрэбна, гэта дыскатэка, а не мастацкая галерэя. Сюды прыходзяць не сцэны разглядваць, якія і так «падпіраюць» хлопцы і дзяўчаты, што не любяць ці, хутчэй, папросту саромеюцца танцаваць.

Большасць народу ўсё ж «тусуецца» пасярэдзіне залы. Моладзь кожнай вёскі звычайна танцуе асобным колам. Не тое, каб існавала дзяленне на сваіх і чужых, але падчас танцаў лепш нікога не штурхаць, нават выпадкова, паколькі асноўныя наведвальнікі дыскатэкі — гэта падлеткі, якія ўсё ўспрымаюць на эмоцыях і гатовыя лезці «ў разборкі» без прычын. У нас сур'ёзныя бойкі здараюцца нячаста (дзякуй за гэта супрацоўнікам ДК, бо яны адразу ж спыняюць дыскатэку і разганяюць усіх па дамах). Таму калі самому нікога не чапаць, то можна правесці вечар без нечаканых прыгод.

**Пра хлопцаў: для іх правесці дзяўчыну ў іншую вёску — гэта сапраўды сур'ёзны ўчынак, усё адно што прылюдна пракрычаць аб сваёй сімпатыі да яе.**

Для многіх, хто ходзіць на вясковую дыскатэку, у тым ліку для мяне і маіх сябровак, самым прыемным з'яўляецца магчымасць патанцаваць пад любімую музыку. Дыджэі тут не кіруюцца асабістымі густамі ці апошнімі музычнымі тэндэнцыямі, а ў першую чаргу ўлічваюць пажаданні моладзі. І насуперак стэрэатыпам на нашай дыскатэцы рэтра гучыць толькі на Новы год, у астатні час моладзь замаўляе сучасныя трэкі розных жанраў.

Дзвюх гадзін танцаў звычайна хапае ўсім, каб стаміцца. Але канец дыскатэкі не азначае, што вечар скончаны. Асаблівая для хлопцаў і дзяўчат, што жывуць у іншых вёсках. Летам, бывала, ідзеш дадому і не спяшаешся, бо ноч цёплая, а над галавой зззяюць тысячы зорак, у траве каля дарогі — зялёныя светлячкі. А калі яшчэ які хлопец праводзіць, дык зусім павольным крокам рухаешся. Дарэчы, пра хлопцаў: для іх правесці дзяўчыну ў іншую вёску — гэта сапраўды сур'ёзны ўчынак, усё адно што прылюдна пракрычаць аб сваёй сімпатыі да яе, тым больш што на наступны дзень усе навокал яшчэ і гаварыць пра гэта пачнуць. Аднак плёткі — гэта не самае страшнае, страшна праводзіць дзяўчыну зімой. Яна ж прыйшла дадому і ў цяпло, а хлопцу яшчэ пасля пляцся назад па снезе ў дваццаціградусны мароз. Маладосць. Рамантыка.

**Ганна КУРАК,**
**студэнтка V курса**
**Інстытута журналістыкі.**

*Нотка настальжы*

# Праз гады-пакаленні

**Зазірнуўшы на «Дзявочнік», так і хочацца сказаць: за без малога трыццаць гадоў нічога не змянілася! Вядома, там, дзе вясковыя дыскатэкі яшчэ захаваліся. Хіба толькі музыку цяпер круцяць ужо не на бабінных ці касетных магнітафонах.**

...Гэтак жа пэўны мікрараён ці вёска ўтваралі ў танцавальнай зале клуба сваё асобнае кола. Можна было схадзіць у «госці» ці прыняць іх у «сябе». Вядома, калі стасункі паміж вуліцамі ці вёскамі на гэты момант былі добразычлівымі. Інакш была рызыка нарвацца на «пайшлі выйдзем». Гэтак жа сапраўдныя «казырныя пацаны» ніколі не прыходзілі да пачатку дыскатэкі. Добрым густам лічылася з'явіцца на танцах недзе ў сярэдзіне, падчас вялікага перапынку. Маўляў, праходзіў міма, вырашыў заскочыць па сваю «малую»... Дыджэяў, якія ўлічвалі густы наведнікаў, паважалі, а тых, хто ўпарта круціў песні на свой капыл, — не вельмі. У апошнім выпадку многія нават прапускалі танцы. Мецъ знаёмства з добрым дыджэем каштавала дарагога: і з днём нараджэння некага можна было павіншаваць, і «персанальную» песню для дзяўчыны замовіць. А пасля танцаў абранай кампаніяй застацца ў каморцы з апаратурай... Нешта забароненае ў залу сапраўды праносілі рэдка: на ўваходзе стаяла мажная цётка Тома, якая не толькі правярала білеты, але нярэдка выконвала і ролю «рамкі» на ўваходзе. Рабілі проста: пакідалі прынесенае да вялікага перапынку, калі большая частка прысутных выходзіла на свежае паветра асвяжыцца, пад бліжэйшым кустом, а зімой — у гурбе снегу... А паход у суседнюю вёску позна ўвечары, асабліва летам? Цяплынь, зоркі ў начным небе... Зноў жа, калі ісці даводзілася не ў «варожы стан»... І, так, усе нейкім невераго дным чынам адразу заўважалі, хто з кім пайшоў. Маладосць... Каб на нейкі час зноў туды...

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

*Першая спроба*

# СТУДЭНТ ШУКАЕ РАБОТУ...

## ШТО ТРЭБА ВЕДАЦЬ, КАБ ЯЕ ЗНАЙСЦІ?

**«Ваш працоўны досвед?» — такое пытанне даводзілася чуць кожнаму, хто спрабаваў знайсці работу. А што, калі яно адрасавана нядаўняму выпускніку ВНУ, чые веды адпавядаюць прынцыпу «ўсяго патроху». На гэта пытанне адказала Карына МІХАЛЕВІЧ, заснавальніца інтэрнэт-праекта па пошуку работы для студэнтаў «Jellyfish».**


Каманда «Джэліфіш» (Карына ў цэнтры).

— На чацвёртым курсе ўніверсітэта я сур'ёзна задумалася наконт працаўладкавання. Вопыту ў мяне ніякага не было, акрамя штогадовай месячнай вучэбнай практыкі. На жаль, у большасці такіх выпадкаў студэнт і працадаўца сустракаюцца ўсяго два разы, у першы і апошні дзень практыкі. Гэта можа адбывацца з розных прычын. Кампанія не гатова марнаваць час і грошы на навучанне староннята чалавека, другі варыянт — студэнт не матываваны, ён не цікавіцца справамі кампаніі і, наогул, прыйшоў туды дзеля «птушачкі». Асабліва гэта датычыцца студэнтаў першых курсаў. А час ляціць хутка, і раптам ты разумееш, што нічога не ведаеш і не ўмееш. Так я прыйшла да неабходнасці пошуку стажыроўкі. Праштудзіраваўшы некалькі сайтаў, заўважыла, што прапаноў такога кшталту мала і ўсе яны раскіданыя. Я стварыла групу «УКантакце» і стала збіраць існуючыя ў інтэрнэце запрашэнні. Гэта ідэя была падтрымана карыстальнікамі сацыяльнай сеткі. Так у мяне і саспела ідэя стварыць адзіную мультыплатформу па пошуку работы для студэнтаў, — распавяла Карына.

«З намі супрацоўнічаюць больш як 150 кампаній. У сярэднім за месяц мы атрымліваем 30—40 прапаноў. Ад 8 да 15 чалавек штомесяц знаходзяць праз нас месца работы. Для тых, хто шукае заробак, стажыроўка — не лепшы варыянт. Кіраўніцтва калі і будзе плаціць, гэтага хопіць хіба на праезд да лёгкія «перакусы». А вось прымяніць тэарытычныя веды, атрыманыя ў інстытуце, зацікавіць працадаўцу і атрымаць месца — іншая справа. Ведаеце, прасцей навучыць студэнта, чым пераробліваць пад сябе прафесійна сфарміраваную асобу. Пасля стажыроўкі кампанія будзе лабіраваць вашу кандыдатуру, бо на вас выдаткаваны пэўныя сродкі».

Як расказала далей Карына, найбольшую складанасць для студэнтаў уяўляе напісанне рэзюмэ — калі яны разумеюць, што ў іх няма досведу, а пад гэты пункт адведзена больш за ўсё палёў, то міжволі пачынаюць панікаваць. Звычайна ў такіх выпадках саіскальнік не піша нічога. А трэба ўсё ж такі пастарацца прыгадаць, магчыма, вы набылі нейкія навыкі падчас практык або пісалі курсавую па тых пытаннях, што датычацца палітыкі кампаніі. А там, дзе патрабуецца расказаць пра сябе, студэнты звычайна проста капіруюць нешта з інтэрнэту.

— Праглядаючы рэзюмэ, заўважыла яшчэ адну распаўсюджаную памылку — жаданне расказаць пра ўсе прафесійныя сферы, у якіх выпала быць задзейнічанымі. Напрыклад, дзяўчына шукае стажыроўку на пасаду менеджара, а піша, што працавала ў «Макдональдсе». На нашым сайце мы ўвялі відэарэзюмэ. Гэта папулярная сусветная практыка, але да нас прыйшло пакуль толькі адно такое пасланне, дзе дзяўчына расказвала пра сябе на англійскай мове. Атрымалася вельмі эфектна, — працягвае заснавальніца інтэрнэт-праекта.

Напрыканцы размовы Карына падзялілася планамі на будучыню.

— Мы ўводзім практыку тэматычных семінараў, куды запрашаем працадаўцаў і студэнтаў, дзе апошнія могуць задаць пытанні, якія датычацца палітыкі кампаніі і іншага. На нашым сайце будуць прадстаўлены не толькі актуальныя стажыроўкі, але і карысныя парады, лайфхакі, інтэрв'ю стажораў і прадстаўнікоў кампаній. Мы збіраемся публікаваць падборку кніг, сайтаў, інтэрнэт-рэсурсаў для прафесійнага развіцця. Асноўнай «фішкай» будуць відэаагляды офісаў лепшых кампаній. Робіцца гэта для таго, каб студэнт мог пазнаёміцца з карпаратыўнай культурай магчымага месца работы. Грошы на распрацоўку сайта мы збіралі праз краўдфандынг: за два месяцы — сем мільёнаў рублёў старымі. Фатаграфіі нашых дабрачынцаў мы размесцім на сайце ў раздзеле «Алея славы». Наогул, будзем старацца напаўняць кантэнт цікавымі рэчамі. Наша каманда — нядаўнія студэнты, маладыя спецыялісты, якія самі памятаюць, як шукалі работу і чаго ім канкрэтна не хапала. Цяпер мы яшчэ вырашаем пэўныя пытанні, якія датычацца дызайну, вёрсткі, але ў хуткім часе плануем канчаткова запусціцца.

**Алена ЯКАВЕНКА.**

*Ідэі маладых*

# Самі для сябе

## «Хмарцы» — бязвоблачнай будучыні!

**Займець уласны бізнес марыць ледзь не кожны малады чалавек. Сапраўды, хто не хацеў бы такое месца работы, дзе ўсё залежала б толькі ад яго рашэнняў, а пры добрым супадзенні абставін яшчэ і прыносіла добры прыбытак? Але рызыкнуць уласнымі грашыма і стварыць працоўнае месца для саміх сябе рашаюцца адзінкі. Сярод іх — чацвёртакурснікі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Мікіта ПУШНОЎ з факультэта камп'ютарных сістэм і сетак і Ганна ЛОСЬ з інжынерна-эканамічнага факультэта. Паўтара года таму яны адкрылі IT-кампанію з рамантычнай назвай «Хмарка». Сёння фірма займае цэлы офіс у цэнтры сталіцы, а ў яе штаце — каля дзесяці чалавек.**

Пытання са стартавым капіталам перад кампаньёнамі не стаяла. Прыцягальнасць сферы IT у тым, што для старту патрэбныя толькі камп'ютар, інтэрнэт і вольны час, лічыць Мікіта. Выдаткі студэнты пакрывалі з уласных зберажэнняў, потым кампанія пачала зарабляць на сябе сама.

— Зразумела, увайсці на IT-рынак, дзе хапае моцных гульцоў, не так проста, — расказвае Мікіта. — Нам на першым этапе было цяжка сябе пазіцыянаваць, таму мы хапаліся за любыя праекты, якія знаходзілі: за стварэнне вэб-сайтаў, мабільных праграм... Гэта, пэўна, было нашай памылкай — мы так пашырылі кола паслуг, што не маглі сябе лаканічна прадставіць кліентам. Цяпер вось мэтанакіравана шукаем тыя сферы, у якіх мы мацнейшыя. Галоўнай «фішкай», якая вылучае нас сярод іншых, сталі маркетынгавыя даследаванні, якія праводзім перад тым, як нешта ствараць. Аналагічную паслугу аказваюць усяго некалькі беларускіх кампаній.

Першым праектам для «Хмаркі» стала стварэнне вялікай карпаратыўнай сістэмы для расійскай кампаніі, якая прадае квіткі на масавыя мерапрыемствы. Фактычна яго рэалізацыя працягваецца і сёння. Каманда стварала мабільныя праграмы, вэб-сайт, распрацоўвала дызайн — па сутнасці, аказвала поўны спектр IT-паслуг.

Мікіта расказвае, што заказчыкі знайшліся праз так званыя фрыланс-біржы — сайты, дзе праграмісты без пастаяннага месца работы прапаноўваюць свае паслугі. Вырашальным для расіян момантам стала тое, што ім спадабалася манера размовы айцішнікаў-пачаткоўцаў. Такая, здавалася б, дробная дэталь вырашыла лёс кампаніі...


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Заказы і дагэтуль з'яўляюцца для нас праблемай, — прызнаецца Ганна. — Большасць хочуць наймаць вядомыя кампаніі, якія ўжо добра сябе зарэкамендавалі, маюць вопыт не менш як пяць гадоў, партфоліа ў тысячу праектаў, штат у паўтары сотні чалавек... Таму мы робім стаўку на персанальную работу — самі шукаем кліентаў, вядзём з імі перамовы.

Цяпер у скарбонцы «Хмаркі» ўжо дзясяткі праектаў. Сярод галоўных стваральнікі вылучаюць, напрыклад, сэрвіс па заказе грузавога таксі накшталт сусветна вядомага Uber для адной з французскіх кампаній. Ёсць таксама праект, які выконваюць для адной з прыватных стаматалагічных клінік, — ім патрэбны сайт з магчымасцю заказу квіткоў праз інтэрнэт, наяўнасцю віртуальнай карткі пацыента і іншымі «наваротамі». Смеючыся, стваральнікі кампаніі называюць адным з галоўных праектаў і свой уласны сайт — ён перарабляўся ўжо дзевяць разоў, пакуль вынік не задаволіў усіх.

Ці не замінае ўласны бізнес вучобе? Юныя прадпрымальнікі сцвярджаюць, што не. У Ганны, напрыклад, сярэдні бал за сесіі пачынаецца з 9,8. Мікіта кажа, што ў яго ўсё не так бязвоблачна, але хлопец першапачаткова аддаваў прыярытэт рабоце, а не вучобе. Вядома, часам прыходзіцца выбіраць, расклад не заўсёды зручны, каб паспяваць на работу. Але некаторыя выкладчыкі, наадварот, рады, калі студэнты могуць прывесці ў прыклад свой уласны вопыт.

— Цяпер мы трохі застылі ў сваім развіцці, — канстатуе Мікіта. — Гэта як з дзіцем — спачатку яно расце хутка, але калі становіцца старэйшым, рост запавольваецца. Таму нам трэба шукаць новыя варыянты для развіцця, напрыклад выходзіць на заходнееўрапейскі ці амерыканскі рынкі, шукаць заказчыкаў там. Гэта вельмі важны досвед, які можа прынесці шмат новага.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

# ВОСЕМ ГАДЗІН ФІТНЕСУ... З АНУЧАЙ

## НЯХАЙ МЯНЕ НАВУЧАЦЬ

Чатыры гады таму Максім працаваў начальнікам вытворчасці на прадпрыемстве, дзе выраблялі ўпаковачную тару, потым завод перапрадалі, сярод работнікаў пачаліся скарачэнні, і хлопец апынуўся ў хісткай сітуацыі. Трэба было шукаць занятак, і малады чалавек выбраў прадпрымальніцтва — аказанне клінінгавых паслуг. Напачатку быў кіраўніком і выканаўцам у адной асобе — прымаў заказы, прыбіраў і пастаянна набіраўся вопыту: чытаў матэрыялы ў інтэрнэце, шукаў відэа, вывучаў хімічныя асаблівасці мыйных сродкаў, праглядаў форумы і ездзіў у Маскву на спецыялізаваныя выставы.

— Да ўсякай справы павінна прыкладацца ўменне, — разважае Максім. — Тут як з прасам працаваць: нібыта проста, а без досведу і кашулю спаліць можна. Часам заказчыкі, каб сэканоміць, наймаюць для прыбірання студэнтаў, а потым расстройваюцца, бо няправільна апрацаваныя рэчы сапсаваліся. Калі ўжо вырашана наняць памочніка, то няхай яны будуць прафесіяналамі. Для клінераў існуюць спецыяльныя курсы, але асноўныя веды навічкі атрымліваюць з практыкі ад старшага майстра.

Сярэдні заробак прафесійнага прыбіральшчыка за дзень складае каля 50 рублёў. Большая частка клінераў — моладзь, якая хоча пакуль падумаць, вызначыцца з далейшым шляхам і адначасова падзарабіць грошай. Прыбіраць чужыя кватэры ідуць як студэнты, так і больш дарослыя людзі, у многіх ёсць дыпломы настаўніка, медыка, тэхніка або юрыста, сустракаюцца ваенныя ў адстаўцы. Максім прыгадвае амаль анекдатычны выпадак, калі клінінгам два месяцы займаўся... дырэктар фірмы. Як той потым казаў, пераключэнне на фізічную працу даў час галаве згенерыраваць новыя ідэі для развіцця справы.

## КАЛІ ПРЫХОДЗІЦЬ ГАСПАДАР...

Пакуль размаўляем, старанна адціраю анучкай шафу ад будаўнічага пылу. Здавалася б, работы на пяць хвілін, а прыглядзішся — бачныя сляды абутку, грыфеля алоўка, плямы ад далоняў. І вось, калі я ўжо збіраюся з палёгкай зачыніць дзверцы, Максім знаходзіць «брак у рабоце» — праводзіць пальцамі па ніжняму баку шуфляды і паказвае шэры пылок. Аказалася, што заказчыкі так часта правяраюць якасць паслугі, праводзячы рукой па самых нечаканых паверхнях.

— Мы аднойчы цырульню прыбіралі, — расказвае Максім выпадак з практыкі, — патрацілі каля 20 гадзін, а выцерці пыл над дзвярыма забыліся. Гаспадар жа прыйшоў у дрэнным настроі і якраз над уваходам далонню правёў. Тады мы хуценька ўсё выправілі, але крыўдна і сорамна было. З часам прывучаеш сябе прыбіраць паверхні «ў трох вымярэннях».

**З ацэнкай часу, дарэчы, я памылілася: «лёгкую» кватэру клінеры прыбіраюць каля 8 гадзін. Бывае, работа цягнецца 10—12 гадзін.**

Прыборку на дом людзі заказваюць з розных прычын: нехта хворы, нехта прападае на рабоце ледзь не суткамі, камусьці танней заплаціць клінеру, чым прапусціць важную сустрэчу. Кошт чысціні на адным метры вызначаецца на ўзроўні 4 рублёў і залежыць ад складанасці працы. Звычайна клінінгавыя кампаніі прапануюць уборкі генеральную, штодзённую і пасля рамонту. Першая, па словах Максіма, самая цяжкая:


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Жывуць людзі ў кватэры дзесяць гадоў, а потым нечакана вырашаюць прыбраць. Зразумела, што за гэты час дом «аброс» рэчамі, а бруд уеўся ў паверхні. Нават калі чысціць увесь дзень, новым рукамыйнік ці пліта не стане, а гаспадары часам гэтага не разумеюць, таму здараюцца і непрыемныя сітуацыі. Лепей за ўсё, калі на час работы кватэра пустуе — так клінерам лягчэй псіхалагічна, і заказчыку пасля вяртання адразу бачны вынік. З іншага боку, адчуваеш сябе больш спакойна, калі кліент знаходзіцца побач і бачыць, за што ён плаціць грошы. Недапрацоўкі выпраўляюцца адразу на месцы цягам дзесяці хвілін. Прыбіральшчык таксама чалавек і можа забыцца працерці нейкі прадмет. З вопытам клінер ужо аўтаматычна заўважае патэнцыйныя забруджванні, вопытныя кантралююць маладых, і таму гаспадары рэдка наракаюць на якасць.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
*yurgel@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

# Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | - Капитальное строение, инв. № 400/С-69051 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель), площадью 220,4 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121К/2.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-69021 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 243,9 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121К/1.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-69106 (назначение – здание многофункциональное), площадью 1209,3 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121К.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97342 (назначение – сооружение неустановленного назначения), площадью 2070,0 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания зданий столярной мастерской, блока складов и механического цеха, склада КиПа.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97348 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 68,6 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию блока складов и механического цеха.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97337 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 81,3 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная ливневая канализационная сеть к блоку складов.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97332 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 104,5 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод к блоку складов и механическому цеху.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97387 (назначение – сооружение специализированное энергетики), протяженностью 228,7 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ от РП-10кВ до ТП-3 до ТП-4.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97379 (назначение – сооружение специализированное энергетики), протяженностью 61,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть 0,4 кВ к блоку складов и механическому цеху.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-85886 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 343,9 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- шкаф распределительный ПР-24-7208;<br>- трансформаторная подстанция 2 РТ 1000/10 № 1;<br>- распределительный пункт ПР-24-11-7205;<br>- трансформатор масляный силовой ДУ-ТМЗ-1000/10 ТП-2;<br>- трансформатор масляный силовой ДУ-ТМЗ-1000/10 ТП-2;<br>- распределительный пункт ПР-24-7210-54УЗ;<br>- теплосчетчик ТС-07ХХ-88 «Струмень»;<br>- туя (1 единица) |
| Земельный участок, на котором расположен объект | - кадастровый номер 440100000002008242, площадью 0,9480 га (назначение – для обслуживания зданий столярной мастерской (инвентарный номер 400/С-69051), блока складов и механического цеха (инвентарный номер 400/С-69106), склада КиПа (инвентарный номер 400/С-69021) по адресу: г. Гродно ул. Максима Горького, 121 К.<br>- кадастровый номер 440100000002006868, площадью 0,0007 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006869, площадью 0,0007 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006871, площадью 0,0003 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006872, площадью 0,0002 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006873, площадью 0,0002 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006874, площадью 0,0003 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006875, площадью 0,0037 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006876, площадью 0,0002 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006877, площадью 0,0003 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006878, площадью 0,0003 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006879, площадью 0,0312 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети), расположенные по адресу: г. Гродно ул. Максима Горького, 121 |
| Начальная цена продажи | 183 199,38 р. (сто восемьдесят три тысячи сто девяносто девять рублей тридцать восемь копеек) без учета НДС |
| Сумма задатка | 9 159,97 р. (девять тысяч сто пятьдесят девять рублей девяносто семь копеек) |
| Условия аукциона | Без условий |
| **ЛОТ 2** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | - Капитальное строение, инв. № 400/С-89984 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – ангар), площадью 449,7 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Ж;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-69050 (назначение – здание специализированное трубопроводного транспорта, наименование – насосная станция), площадью 187,6 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Ж/1;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97340 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории), площадью 105,0 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания здания автоматической насосной станции, резервуара для воды и здания ангара;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-58952 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – резервуар для воды на 500 куб.м), объемом 500 куб.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97349 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация), протяженностью 43,20 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию насосной станции;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97339 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная ливневая канализация), протяженностью 43,85 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная ливневая сеть к резервуару для воды;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97334 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод), протяженностью 24,45 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121 внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод к зданию автоматической насосной станции;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97386 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная сеть наружного освещения), протяженностью 267,15 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121 внутриплощадочная сеть наружного освещения здания автоматической насосной станции, резервуара для воды и здания ангара;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97378 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная электрическая сеть 0,4 кВ), протяженностью 119,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть 0,4 кВ к зданию автоматической насосной станции;<br>- тополь (2 единицы); - каштан (14 единиц) |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 440100000002008244, площадью 0,4859 га (назначение – для обслуживания здания автоматической насосной станции (инв. № 400/С-69050), резервуара для воды на 500 куб.м (инв. № 4660) и здания ангара (инв. № 400/С-89984)) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Ж |
| Начальная цена продажи | 74 017,06 р. (семьдесят четыре тысячи семнадцать рублей шесть копеек) без учета НДС |
| Сумма задатка | 3 700,85 р. (три тысячи семьсот рублей восемьдесят пять копеек) |
| Условия аукциона | Без условий |
| **ЛОТ 3** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | - Капитальное строение, инв. № 400/С-63419 (назначение – здание нежилое, наименование – здание установки контактного выпаривания), площадью 662,4 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Д;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97341 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории), площадью 165,0 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания здания установки контактного выпаривания, резервуара;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-58964 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – резервуар на 250 куб.м пожарно-аварийный водоем), объемом 250 куб.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97347 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация), протяженностью 365,10 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию установки контактного выпаривания;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97335 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод), протяженностью 22,15 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод к зданию установки контактного выпаривания;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97385 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная сеть наружного освещения), протяженностью 103,70 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная сеть наружного освещения здания установки контактного выпаривания, резервуара;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97382 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная электрическая сеть 0,4 кВ), протяженностью 117,70 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть 0,4 кВ к зданию установки контактного выпаривания;<br>- шкаф распределительный ПР-24-7208; - липа (4 единицы); - тополь (2 единицы) |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 440100000002008243, площадью 0,2356 га (назначение – для обслуживания здания установки контактного выпаривания (инв. № 400/С-63419), резервуара на 250 куб.м. ПАВ (инв. № 4702)) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Д |
| Начальная цена продажи | 67 856,69 р. (шестьдесят семь тысяч восемьсот пятьдесят шесть рублей шестьдесят девять копеек) без учета НДС |
| Сумма задатка | 3 392,83 р. (три тысячи триста девяносто два рубля восемьдесят три копейки) |
| Условия аукциона | Без условий |
| **ЛОТ 4** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | - Капитальное строение, инв. № 400/С-69029 (назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – блок предочистки), площадью 320,4 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Е;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97343 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории), площадью 390,0 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания здания блока предочистки;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97350 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация), протяженностью 12,50 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию блока предочистки;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97331 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод), протяженностью 190,40 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод к зданию предочистки;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97381 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная электрическая сеть 0,4 кВ), протяженностью 80,80 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть к зданию блока предочистки;<br>- липа (12 единиц); - шкаф распределительный; - дерен белый (1 единица) |
| Земельный участок, на котором расположен объект | кадастровый номер 440100000002008245, площадью 0,2180 га (назначение – для обслуживания здания блока предочистки (инв. № 400/С-69029)) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Е |
| Начальная цена продажи | 86 133,94 р. (восемьдесят шесть тысяч сто тридцать три рубля девяносто четыре копейки) без учета НДС |
| Сумма задатка | 4 306,70 р. (четыре тысячи триста шесть рублей семьдесят копеек) |
| Условия аукциона | Без условий |

| | |
|---|---|
| **ЛОТ 5** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | - Капитальное строение, инв. № 400/С-17193 (назначение – здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий, наименование – главный производственный корпус), площадью 29971,7 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г, состоящее из капитальное строение, инв. № 400/D-152212 (назначение – производственное помещение, наименование – главный производственный корпус), площадью 29418,5 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г-2 и капитальное строение, инв. № 400/D-123114 (назначение – помещение неустановленного назначения, наименование – помещение неустановленного назначения), площадью 523,0 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г-1;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-69015 (назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – автоматическая насосная станция пожаротушения), площадью 160,5 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г/2;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-69014 (назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – КПП-120), площадью 19,6 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г/1;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97344 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории), площадью 7950,0 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания зданий и сооружений главного производственного корпуса;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-86338 (назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – резервуар для хранения 8%-ого раствора пенообразователя), объемом 250,0 куб.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-58965 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – резервуар на 1000 куб.м), объемом 1000 куб.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-89988 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – площадка под емкости), площадью застройки 119,0 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-85888 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), протяженностью 586,05 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97346 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация), протяженностью 325,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию главного производственного корпуса;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-89982 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внеплощадочная ливневая канализация), протяженностью 1940,20 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97338 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная ливневая канализация), протяженностью 1189,75 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная ливневая сеть к зданиям и сооружениям главного производственного корпуса;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-89983 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внеплощадочная напорная канализация), протяженностью 243,80 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-86070 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная тепловая сеть), протяженностью 729,35 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-62631 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – паропровод), протяженностью 457,95 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55845 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внеплощадочная кабельная линия, напряжением 10 кВ), протяженностью 1018 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-74384 (назначение – сооружение специализированное связи, наименование – внутриплощадочная телефонная канализация), протяженностью 193,20 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97333 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод), протяженностью 582,90 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод к зданиям и сооружениям главного производственного корпуса;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-74876 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный пожарный водопровод), протяженностью 227,80 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-74877 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный пожарный водопровод), протяженностью 991,36 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97384 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная сеть наружного освещения), протяженностью 420,40 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, внутриплощадочная сеть наружного освещения зданий и сооружений главного производственного корпуса;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97380 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная электрическая сеть 0,4 кВ), протяженностью 353,15 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть 0,4 кВ к зданиям и сооружениям главного производственного корпуса;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97392 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ), протяженностью 473,70 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ от РП-10 кВ до ТП-1, от ТП-1 до ТП-2;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55838 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная напорная канализация), протяженностью 277,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55842 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный производственный водопровод), протяженностью 1305,15 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-85887 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – мостовое сооружение), протяженностью 48,00 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ марки ААБл3*95, протяженностью 155 м;<br>- Внутриплощадочная кабельная линия 0,4 кВ марки АВБбШв, протяженностью 70 м;<br>- пункт распределительный (50 единиц);<br>- камера КСО-272 (2 единицы);<br>- трансформаторная подстанция 2 КТП 1000/10 ТП-4;<br>- камера КСО – 3 комплекта;<br>- панель ЩО-7024;<br>- шкаф вводно-распределительный ВРУ-1;<br>- трансформатор масляный ТМЗ-1000/10 Т-4 (2 единицы);<br>- трансформатор масляный силовой ДУ-ТМЗ-1000/10 ТП-2 (4 единицы);<br>- трансформаторная подстанция 2 КТП 1000/10,3 (2 единицы);<br>- трансформаторные ячейки КРУ-821-00848 (2 единицы);<br>- шкаф S-9522-13;<br>- вентилятор центробежный с эд/двиг. (7 единицы);<br>- камера орошения КТЦ-2-63;<br>- бак сбора выпарки 10 куб. м;<br>- камера орошения КТУ-2-40 (7 единиц);<br>- кондиционер (6 единиц);<br>- бак сбора конденсата 10 куб. м (2 единицы);<br>- пресс для угаров АРО-1 (2 единицы);<br>- смесовая машина;<br>- красильный аппарат типа «Линдер»;<br>- набивная машина НВ-150;<br>- центрифуга ФМК-1521-К1;<br>- механизированный лабаз ЛРМ-40М-1;<br>- кисловочная машина с отжимными валами;<br>- аппарат красильный АКДУ-601 с поддонами 2 (единицы);<br>- механизированный лабаз ЛРМ-40М-1 (2 единицы);<br>- бункер пылеулавливающий 3730*2800*2310 (8 единиц);<br>- агрегат для сушки волокна АСВ-120-Ш;<br>- красильно-промывная машина МКП-Ш-1;<br>- таль электрическая г/п 1 т (2 единицы);<br>- дизель-генератор ДГА-3-48;<br>- туя (4 единицы);<br>- липа (4 единицы);<br>- бак-мешалка объемом 0,63 куб. м;<br>- бак-мешалка, объемом 1,6 куб. м;<br>- сборник стальной эмалированный 2,0 куб. м;<br>- станина и барабан спирально-бильного волчка;<br>- настил пола стальной с просечкой 25 кв. м;<br>- двутавр стальной горячекатаный № 26 (47 м);<br>- двутавр стальной горячекатаный № 10 (15 м);<br>- двутавр стальной горячекатаный № 18 (27 м);<br>- швеллер стальной горячекатаный № 18 (44 м);<br>- уголок стальной горячекатаный № 50 (20 м) |
| Земельный участок, на котором расположен объект | - кадастровый номер 440100000002000562, площадью 4,8205 га (назначение – обслуживание зданий и сооружений главного производственного корпуса) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г;<br>- кадастровый номер 440100000002006864, площадью 0,0078 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста); кадастровый номер 440100000002006865, площадью 0,0016 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста); кадастровый номер 440100000002006866, площадью 0,0014 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста); кадастровый номер 440100000002006867, площадью 0,0073 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121 |
| Начальная цена продажи | 1 964 145,64 р. (один миллион девятьсот шестьдесят четыре тысячи сто сорок пять рублей шестьдесят четыре копейки) без учета НДС |
| Сумма задатка | 98 207,28 р. (девяносто восемь тысяч двести семь рублей двадцать восемь копеек) |
| Условия аукциона | Без условий |
| Продавец | РУПП «Гроднотекстиль», 230015, г. Гродно, ул. Горького, 121, тел./факс 43-99-64 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»,<br>г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012579170017<br>в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |
| **Аукцион состоится 31 октября 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209** | |

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 24.07.2015 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:**
**г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**
**Последний день приема заявлений – 25 октября 2016 г. до 15.00.**
**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»,**
**http://grodnoino.by/**

*Нябачныя масты*

# ПА ВЕДЫ — З ПОЎДНЯ АФРЫКІ

**У сталічных ВНУ будуць навучацца студэнты з Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі. 26 маладых людзей у БДАТУ і 17 — у БДУІР. Гэта першы праект па студэнцкім абмене паміж Беларуссю і ПАР. Зараз у Мінск прыехалі хлопцы і дзяўчаты з правінцыі Фры Стэйт. Нашы размоўцы — будучыя студэнты Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта Юніс ДЖЭСЕНІ і Зама СІГВАБЭЛА.**

Хлопец і дзяўчына ўжо тры месяцы жывуць у Мінску. На шчасце, жыхары ПАР лёгка могуць адаптавацца да іншай культуры, бо ў іх краіне 11 афіцыйных моў. Культура каларытная і разнастайная. Юніс гаворыць, што, калі толькі прыехалі, яна не ведала ніводнага слова па-руску. Зараз ужо можа сказаць: «Прывітанне. Мяне завуць Юніс. Я студэнтка. Мая родная краіна ПАР. Я вучуся ва ўніверсітэце на падрыхтоўчым факультэце». Вывучаць мову ёй падабаецца.

У Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы клімат цяплейшы, таму будучыя студэнты сур'ёзна рыхтуюцца да беларускай зімы. Зама гаворыць, што на яго радзіме тэмпература звычайна ніжэй за мінус адзін не апускаецца. На пытанне, чаму маладыя людзі прыехалі менавіта ў Беларусь, хлопец адказаў так:

— Беручы пад увагу, што ПАР — краіна, якая развіваецца, мы імкнёмся вывучыць як мага больш. А Беларусь у параўнанні з ПАР больш развітая, і людзі жывуць даволі добра. Гэта вопыт, які мы можам пераняць. Я лічу, што адна з важных сфер для ПАР — аграрны сектар, ён істотна ўплывае на нашу эканоміку. Менавіта таму мы вырашылі атрымаць адукацыю ў гэтай сферы тут.

Як прызнаюцца студэнты, «Гугл» не асабліва ім дапамог падрыхтавацца да вандроўкі. Юніс гаворыць, што «праз інтэрнэт не набудзеш рэальны вопыт. Але праз тыдзень мы адаптаваліся. Нам падабаецца, што тут шмат зеляніны, чыстае паветра. Для нас незвычайна, што цягнікі ходзяць пад зямлёю. Гэта вельмі цікава, у ПАР метро няма».

Цяпер хлопец і дзяўчына наведваюць падрыхтоўчыя курсы пры БДАТУ. А праз год ужо прыступяць да вывучэння асноўных дысцыплін. Юніс будзе вучыцца на інжынера, а Зама — на магістра тэхнічных навук. Яны працягваюць сваё знаёмства са сталіцай і кажуць, што Мінск ім падабаецца. Найбольш уразіў Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, які яны наведалі, Парк Перамогі і Камсамольскае возера.

Юніс і Зама гавораць, што са сваімі «калегамі», якія, як і яны, вырашылі прыехаць вучыцца ў Беларусь, пазнаёміліся толькі за тры дні да вылету. У ПАР у іх былі сумесныя трэнінгі. А цяпер яны ўжо знайшлі добрых знаёмых і ў Мінску. Моўных бар'ераў няма — англійскай і рускай мовам яны вучацца адзін у аднаго.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.
**Юніс Джэсені і Зама Сігвабэла.**

*Прыгоды ў тропіках*

# СУП «ЛЁГКІХ ПАВОДЗІН» І ЗАЛАТЫ БУДА

## Што пакаштаваць і паглядзець беларусам у В'етнаме

**Даўно марыла з'ездзіць у экзатычную краіну. Але самі разумееце, падарожжа з 10-гадзінным авіяпералётам не можа быць танным. А тут пачула ад знаёмых, што адпачынак у В'етнаме каштуе не нашмат даражэй, чым у Еўропе. І «загарэлася», хоць пра краіну ведала толькі тое, што адтуль прывозяць мае любімыя сушаныя бананы і на чале ўлады там камуністы. Чаму в'етнамцы ходзяць у масках, навошта ў мясцовых дамах робяць алтары і як «апрацоўваюць» зярняты для самай дарагой кавы ў свеце?**

### Тры кіламетры на фунікулёры

Самы папулярны курортны горад у турыстаў — Нячанг. У ім я і спынілася. Экскурсію па Нячангу лёгка зладзіць самастойна: да ўсіх славутасцяў можна дабрацца пешшу ці на грамадскім транспарце. Мясцовыя гарадскія аўтобусы вельмі камфортныя. Калі за акном 30-градусная спякота, у прахалодным салоне напоўніцу працуюць кандыцыянеры і гучыць азіяцкая папса.

З таго, што варта паглядзець у Нячангу, — Сад камянёў, Чампскія вежы По Нагар (іх прызначэнне — пакланенне індуісцкім бажаствам), будысцкая пагада Лонг Шонг і статуя Буды, які сядзіць (хоць будысцкіх храмаў у В'етнаме шмат, большасць людзей — атэісты; пры гэтым каля 90 працэнтаў мясцовых жыхароў захоўваюць культ продкаў і маюць у гасцінай дома своеасаблівы алтар з фотаздымкамі памерлых сваякоў).

Не абмініце Інстытут акіянаграфіі (квіток каштуе крыху больш за два нашых рублі). Тут можна пабачыць чучалы марскіх млекакормячых, дзіцятарычных пачвараў, сотні бутэлек з «закансерваванымі» ў фармаліне воднымі жыхарамі і гіганцкі шкілет кіта, знойдзены в'етнамскімі фермерамі.

Побач з Нячангам знаходзіцца востраў забаў Вінперл. Нават калі вы не любіце аквапарк і каруселі, туды варта з'ездзіць: на востраў вядзе самая доўгая канатная дарога ў свеце — 3,3 кіламетра на фунікулёры на вышыні 40—60 метраў над узроўнем мора.

Яшчэ адно цікавае месца непадалёк ад гэтага курортнага горада — востраў малпаў. У часы СССР на ім знаходзілася навуковая лабараторыя, дзе праводзілі вопыты над прыматамі. Калі лабараторыя закрылася, частку жывёл вывезлі, а астатнія разбегліся па востраве. Цяпер гэта месца штосьці накшталт запаведніка.

Каб лепш пазнаёміцца з паўднёвым В'етнамам, я раіла б наведаць яшчэ два гарады — горны Далат і мегаполіс Хашымін. У Далаце — еўрапейскім па атмасферы і клімаце (гэта адзіная в'етнамская правінцыя, дзе вырошчваюць клубніцы) — вас чакае залаты Буда, самы дзіўны гатэль у свеце (яго праз незвычайную архітэктуру яшчэ называюць «шалёным домам») і вадаспады. А Хашымін, ці Сайгон, будзе цікавы аматарам ваеннай тэматыкі. Абавязковыя пункты агляднай праграмы — партызанскія тунэлі Ку Чы (некаторыя з іх пашырылі, каб прапаўзці пад зямлёй мог турыст любой камплекцыі) і Музей вайны (калі пойдзеце знаёміцца з экспазіцыяй, якая расказвае пра турмы ваенных часоў, лепш не фатаграфуйце з успышкай — уся столь занята спячымі кажанамі).


Іншы бок В'етнама.

### «Вочы дракона» са смакам дыні

Экзатычная садавіна — абавязковы пункт у спісе таго, што варта пакаштаваць у В'етнаме. Мяккія жоўтыя манга, маленькія бананчыкі (яны нашмат саладзейшыя за тыя, што прывозяць да нас з Афрыкі), чырвоны рамбутан (пад валасатай скуркай — белыя ягады з кіслінкай). Пітахая, ці «сэрца дракона», па смаку нагадвае недаспелае ківі. А маленькія ягады ланган — дыню (калі здымаеш з іх скурку, разумееш, чаму іх другая назва — «вочы дракона»: праз паўпразрыстую мякаць відна чорная костачка).

У турыстычным даведніку нахвальвалі яшчэ адзін фрукт — дурыян. Называецца ён так праз свой спецыфічны пах (з гэтай прычыны з ім, дарэчы, забараняюць праходзіць у гатэлі і транспарт). Але смак у яго вельмі прыемны, запэўнівалі ў буклеце, дарма турысты не рашаюцца пакаштаваць дурыян. Я рашылася. Не веру даведнікам. На смак гэты фрукт не лепшы, чым на пах.

Што да традыцыйнай в'етнамскай кухні, то адна з самых славутых страў — суп фо («фо» трэба прамаўляць з паніжэннем інтанацыі, бо інакш слова перакладаецца як жанчына лёгкіх паводзін). Гэта сытны булён з рысавай локшынай і курыцай, ялавічынай ці морапрадуктамі. В'етнамцы ядуць яго на снеданак, каб запасціся энергіяй на ўвесь дзень.


Будысцкая пагада ў Нячангу.

Папулярныя таксама бліны з рысавай паперы, рысавыя піражкі і рыбны соус, які в'етнамцы заўсёды падаюць да стала. Пра апошні трэба расказаць асобна. Гатуецца ён у вялікіх бочках: туды засыпаюць дробную рыбу (звычайна анчоусы) і соль, прыціскаюць каменем і даюць настаяцца некалькі месяцаў. Атрыманая адфільтраваная вадкасць і ёсць соус. Кажуць, яго не дазваляюць вывозіць з краіны, бо в'етнамцы баяцца, што рэцэпт «сплыве». Але здаецца, забарону наклалі хутчэй авіяперавозчыкі: занадта ж едкі пах у таго рыбнага соусу.

В'етнам займае другое месца ў свеце па імпарце кавы, таму аматарам гэтага напою будзе што паспытаць. Акрамя стандартных арабікі і рабусты, тут ёсць свае ўнікальныя гатункі. Напрыклад, лювак, які лічыцца самым дарагім і смачным. Апрацоўваць кававыя зярняты для гэтага гатунку дапамагае... маленькая жывёла — мусанг (накшталт куніцы). Яна жыве на плантацыях і любіць частавацца кававымі пладамі. Пры гэтым выбірае самыя спелыя з іх. Зярняты праходзяць праз страўнік жывёлы і набываюць асаблівы смак і водар. Ёсць яшчэ кава «слон». Як вы ўжо, напэўна, здагадаліся, гатуецца такім жа чынам, як і лювак, толькі з дапамогай іншай жывёлы.

Многія кавярні-барбекю працуюць па сістэме «ўсё ўключана»: плаціце толькі за ўваход (25 рублёў на нашы ў сярэднім). Добрая магчымасць пакаштаваць некалькі далікатэсаў зараз, напрыклад, мяса страуса ці кракадзіла. Але будзьце гатовыя да таго, што запякаць крэветкі і тунца на грылі вам давядзецца самастойна: на кожным століку для гэтага стаіць міні-пліта.

### Нелагічны шопінг

У чым у В'етнаме разабрацца нескладана, дык гэта ў грашах. Проста ўявіце, што вы ў Беларусі да дэнамінацыі. Адзін долар — прыкладна 22 тысячы в'етнамскіх донгаў. І ніякіх манет. Самы выгадны курс — у аэрапорце і ювелірных крамах. Хоць усё залежыць ад таго, якую купюру вы збіраецеся мяняць: чым драбнейшы намінал, тым менш прывабны курс.

Цэны невысокія. Праўда, толькі на мясцовыя прадукты. Трапічную садавіну прадаюць па два рублі на нашы грошы за кілаграм (калі думаеце, што гэта дорага, прывяду прыклад: у мінскім гіпермаркеце кіло тых фруктаў — напрыклад, пітахая ці рамбутан — каштуе 40—50 рублёў). А за рубель можна набыць магніцік ці бутэльку піва.


**Залаты Буда. Далат.**

**Каля 90 працэнтаў мясцовых жыхароў захоўваюць культ продкаў і маюць у гасцінай дома своеасаблівы алтар з фотаздымкамі памерлых сваякоў.**

Забудзьце на логіку, якая дапамагае рабіць выгадныя пакупкі ў Еўропе. У В'етнаме яна не працуе. У буйных супермаркетах тавары не каштуюць танней: самыя нізкія цэны аказаліся ў маленькай краме побач з гатэлем. А мясцовыя жыхары, якія пад'язджаюць на роварах з кашамі, запоўненымі садавінай, наўпрост да прыбярэжнай зоны, папросяць за манга і бананы не больш, чым на рынку.

Наведваючы славутасці, будзьце ўважлівыя: знаходліві в'етнамцы пастараюцца выбіць з вас грошы за тое, за што плаціць не трэба. Так, у адным з будысцкіх храмаў мужчына (яўна не манах) прынёс мне пахучасці, каб паставіць на алтар, а потым спрабаваў узяць за гэта 10 долараў. Прытым, што на сцяне вісеў плакат, дзе па-руску і па-англійску было напісана, што пахучасці бясплатныя. Увогуле праз наведанне в'етнамцамі замежных моў такія казусы здараюцца часта. Так, аднойчы на пляжы ўвечары пад шыльдай «Асцярожна! Апошнім часам пабольшала выпадкаў атручвання нясвежымі морапрадуктамі, прададзенымі на пляжы» мужчыны з кацялком гандлявалі крабамі і рыбай.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

**Цікавыя факты**

*— У гарадах жыве толькі 30 працэнтаў в'етнамцаў. А вышэйшую адукацыю мае ўсяго чатыры працэнты насельніцтва.*

*— Самы прыгожы чалавек — белы чалавек, лічаць у В'етнаме. Таму месцічы хаваюць скуру ад сонца: носяць адзенне з доўгімі рукавамі, апранаюць пальчаткі і шкарпэткі пад сланцы нават у спякоту, а твар закрываюць маскамі з тканіны (іх прадаюць ва ўсіх буйных крамах). Купацца ў моры ходзяць з самага ранку ці ўвечары, калі няма рызыкі загарэць.*

*— Большасць в'етнамцаў ездзяць на скутарах. Аўтамабіль тут — прадмет раскошы. Турысты часта таксама арандуюць скутары, хоць па сутнасці не маюць права імі кіраваць: у В'етнаме дзейснае толькі мясцовае вадзіцельскае пасведчанне. Але калі вы захоўваеце два асноўныя правілы — не перавышаеце хуткасць і ездзіце ў шлеме — паліцыя вас не спыніць. А вось пешаходныя пераходы тут даволі ўмоўныя: кіроўцы не звяртаюць на іх увагі. Турыстаў, якія падоўгу стаяць на тратуары і не рашаюцца перасекчы дарогу, выручаюць мясцовыя: хапаюць пад руку і пераводзяць на іншы бок.*

SEX=БАЛЯСЫ

# ПРЫГАЖОСЦЬ НЕ ПА ПРАВІЛАХ

**Памятаеце добрую амерыканскую стужку «Гісторыя рыцара» з узыходзячай на той момант «зоркай» Хітам Леджэрам? У самым канцы галоўны герой разам з сябрамі схіляецца над пераможаным ворагам і вымаўляе: «Ты быў узважаны, ты быў вымераны і быў прызнаны ні да чаго не прыдатным!» Гаворка не толькі пра перамогу ў турніры, але і ў больш шырокім сэнсе — дабра над злом. У акцёра, які сыграў ліхадзея, — правільныя рысы твару, яго нават можна назваць абаяльным. Гэта тое, што заўсёды прыцягвае нас да іншых. («Падчас усяго балю прынц не мог адарваць вачэй ад Папялушкі...» — «Тата, а навошта прынцу вочы Папялушкі?») Аднак ёсць у вобразе праціўніка галоўнага героя нешта такое... Карацей кажучы, гэта тыпаж патэнцыяльных «радысак», нягледзячы на знешнюю прыгажосць. Да чаго я хілю?**

Патрапіла на вочы чарговае даследаванне на тэму залатога сячэння. Вядомы пластычны хірург з Вялікабрытаніі Джыліян Дэ Сільва стварыў камп'ютарную праграму, якая можа паказаць, наколькі той ці іншы чалавек блізкі да старажытнагрэчаскіх мерак дасканаласці — таго самага залатога сячэння. Іншымі словамі, калі мы лічым, што твар чалавека непрапарцыянальны, значыць, ён выбіваецца з тых самых правілаў. І вось што цікава: у спісе з «ідэальнымі» тварамі першымі аказаліся асобы, чые імёны большасці з нас мала што скажуць. («У аўтасалоне жанчына звяртаецца да дылера: «Хачу набыць у вас машыну». — «Мадэль?» — «Не, бухгалтар, але за камплімент дзякуй».) А многія прызнаныя прыгажуні свету з ліку актрыс і спявачак або займаюць у ім далёка не рэйтынгавыя месцы, або ўвогуле адсутнічаюць. Адны кажуць, што так атрымалася з прычыны прафесійнай зацікаўленасці самога пластычнага хірурга, які стварыў партрэт ідэальнай жанчыны па «замове» кліентаў. («Дачка пытаецца ў маці: «А як гэта — быць маці самай прыгожай дзяўчыны?» — «Не ведаю, спытай у бабулі».) Іншыя слушна заўважаюць, што нашы ўяўленні пра прыгажосць далёкія ад матэматычных формул. («Я да вас наконт работы?» — «90х60х90?» — «486 тысяч!» — «Увогуле не гэта мелася на ўвазе, але добры бухгалтар нам у мадэльным агенцтве таксама патрэбны!»)



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Колькі людзей, столькі і меркаванняў. Па версіі People, 47-гадовая Джэніфер Эністан была названая нядаўна самай прыгожай жанчынай свету. Сама актрыса сказала, што гэта было для яе нечаканасцю. На яе думку, прыгажосць — гэта мір, дабрыня, упэўненасць у сабе і годна пражытае жыццё. Яшчэ дадала, што лічыць прыгожым не саромецца і не папракаць сябе, калі ў жыцці нешта пайшло не па вызначаным сцэнарыі. Слушная парада, праўда?.. Навукоўцы з інстытута Тэхаса назвалі дзяўчыну з ідэальнай фігурай, хоць яе параметры далёкія ад мадэльных. Рост 34-гадовай Кэлі Брук (брытанскай актрысы і насамрэч мадэлі) —168 сантыметраў, астатняе — 99-63-91. Спецыялісты ўлічылі вагу, рост, форму твару, даўжыню валасоў, узрост і прыйшлі да высновы, што «гэтая дзяўчына па-сапраўднаму натуральная і дасканалая паводле ўсіх параметраў»... Фінскія навукоўцы з універсітэта Турку правялі апытанне сярод больш чым 10 тысяч мужчын з мэтай вызначыць ідэальныя параметры жанчыны. Абагульнены вынік: паненкі ва ўзросце ад 23 да 28 гадоў, што займаюцца інтэлектуальнай працай, з'яўляюцца добрымі суразмоўцамі і даглядаюць сябе... Можа, усё гэта — таксама прыклады «залатога сячэння»? Памятаеце савецкі фільм, назва якога гаворыць у нашу тэму — «Формула кахання»?

...Пакуль адны захапляюцца чужымі ідэальнымі прапорцыямі, іншыя не толькі не пакутуюць ад іх адсутнасці, але, як той казаў, адчуваюць смак жыцця напоўніцу: пакідаюць у захапленні ад саміх сябе іншых і нават зарабляюць на гэтым грошы. Як, напрыклад, 24-гадовая «зорка» «Інстаграма» — амерыканка з непрапарцыянальнымі клубамі. Пры росце 152 сантыметры абхват апошніх у яе складае 177 сантыметраў! Амерыканка не толькі не саромеецца сваёй фігуры, але, наадварот, здолела зрабіць з клубоў трэнд і манетызаваць свой акаўнт. Дзяўчына рэгулярна публікуе свае здымкі ў «Інстаграме», дзе ў яе 166 тысяч падпісчыкаў. Пасля абвінавачвання ў выкарыстанні фоташопу «зорка» выклала і відэа, маўляў, памер сапраўдны. Затое потым фанаты атрымалі магчымасць падпісацца на яе здымкі і відэа па цане 12 долараў у месяц. Добрая падпрацоўка, як той казаў, на роўным месцы. Хоць якое ж яно роўнае?..

**«Дачка пытаецца ў маці: «А як гэта — быць маці самай прыгожай дзяўчыны?» — «Не ведаю, спытай у бабулі».**

А бываюць і ўвогуле анекдатычныя сітуацыі кшталту «каханне злое». Хто не ведае волата-зубра? Дык вось нядаўна пісалі, што адзін такі малады прыгажун вымушаны быў у Кобрынскім раёне шукаць сабе сяброўку сярод... кароў. Нейкае ліха занесла яго далёка ад Белавежскай пушчы і, апынуўшыся ў адзіноце, ён пацягнуўся да рагуль, не засмуціўшыся адсутнасцю родавага «залатога сячэння». («Ты будзеш маім». — «Ну, нават не ведаю, што сказаць...» — «Гэта было не пытанне!») Трэба сказаць, па словах відавочцаў, апошнія прынялі ляснога волата прыхільна. Можа, яны лепш разбіраюцца ў прыгажосці?.. Такая ж гісторыя паўтарылася неўзабаве і ў Рэчыцкім раёне.

Усе мы прыгожыя, і кожны па-свойму. Апроч знешняй прывабнасці, ёсць яшчэ спагадлівасць, здольнасць да нечага, пачуццё гумару і шмат чаго іншага, што ў выніку робіць чалавека ідэальным у нашых вачах. Таму самыя прыгожыя — побач, так? («Кожная з нас — жанчына чыёйсьці мары... Справа толькі за малым — знайсці гэтага летуценніка!»)

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Мару стаць сапраўдным артыстам»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Раскажы пра тых, хто заўсёды побач і дапамагае?***

— Гэта, вядома, мае бацькі. Без іх я нічога б не дасягнуў. Яны заўсёды падтрымліваюць мяне. Таксама мая сястра Аня, якая робіць усе мае фатаграфіі, у гэтай справе яна лепшая. Яшчэ шоў-балет «Сенсацыя» — мае сапраўдныя сябры. З імі я пазнаёміўся, як прыйшоў туды танцаваць. Потым яны даведаліся, што я ўмею яшчэ спяваць і прапанавалі, каб я рабіў гэта з імі. Цяпер на ўсе канцэрты мы ездзім разам, яны заўсёды падтрымліваюць і супакойваюць мяне. Гэтак жа, як і педагог Таццяна Аляксандраўна Трухан.



Фота Ангеліны НОВІКАВАЙ.

Разам з шоў-балетам «Сенсацыя» падчас сустрэчы ў Дзяржынску.

**«Хачу даказаць сам сабе і ўсім іншым, што якую мэту ты ні паставіў бы, усё магчыма. Галоўнае — верыць у сябе і не здавацца».**

***— Рэпетыцыі, канцэрты... А ў іншых абставінах часта спяваеш? Ці ўмееш іграць на музычных інструментах?***

— Заўсёды і ўсюды. Адразу пасля майго выступлення на «Еўрабачанні» выйдзе новая песня, у яе яшчэ няма назвы. Мелодыю песні я склаў сам, а словы напісаў разам з Сяргеем Далматавым. Кампазіцыя будзе пра тое, як я прабіўся, нягледзячы на ўсе перашкоды і цяжкасці... А што пра інструменты, так, іграю на піяніна і акардэоне.

***— Што ты марыш рабіць пасля «Еўрабачання»?***

— Хачу выступіць на «Х-фактары» ў Амерыцы. Буду вучыць англійскую мову і верыць у сябе. Хачу даказаць сам сабе і ўсім іншым, што якую мэту ты ні паставіў бы, усё магчыма. Галоўнае — верыць у сябе і не здавацца.

***— Як спраўляешся са сваім хваляваннем, можа, ёсць талісманы?***

— Я вернік, перад выступленнем малюся, кажу «дзякуй» за ўсё, што ў мяне ёсць, і крочу наперад за марамі і да мэтаў. На шыі ў мяне крыжык, з ім я адчуваю сябе больш упэўнена.

***— Раскажы пра свой рэжым?***

— У мяне шмат абмежаванняў у ежы: забаронена занадта халоднае, вольны час — толькі па начах. Яго я часта марную на прагляд фільмаў. Гэтак жа, калі выпадае хвілінка, люблю пагуляць у тэлефоне або вывучыць новую песню. Наогул, я вельмі таварыскі і ў мяне шмат сяброў. Калі мы гуляем, сумна не бывае.

***— Калі забыцца, што на табе столькі адказнасці, то чаго б хацеў найперш?***

— Вельмі хачу пабываць у Дыснейлендзе. Думаю, усе мараць пра гэта. Гэтак жа я хачу пабываць ва ўсіх краінах і буйных гарадах, асабліва ў Нью-Ёрку. Паесці шкоднага фаст-фуду і папіць салодкай газіроўкі.

***— Хто твой іміджмейкер?***

— За маім знешнім выглядам, як і ўсяго шоў-балета «Сенсацыя», сочыць педагог Алена Уладзіміраўна Бруева. Яна сама шые нам стыльныя касцюмы. Глядзіць, каб было камфортна ў іх выступаць. Часта яна сама ўсё прыдумае і абдумае ці возьме якую-небудзь рэч і пераробіць яе кардынальна.

***— Якія з выступленняў найбольш запомніліся?***

— У Артэку. Там проста неверагодна цёплая абстаноўка. Я хачу там пабываць, у гэтай атмасферы, прычым не проста з выступленнем, а правесці ўсю змену.

***— Раскажы пра свой самы першы выхад перад гледачамі.***

— Гэта было ў садку. Я выконваў песню «Сонечны круг», і выхавальнікі сказалі маім бацькам: «Ён жа добра спявае». Тыя аддалі мяне ў вакальную студыю, і вось з таго часу я і пачаў займацца музыкай.

**«Калі выпадае хвілінка, люблю пагуляць у тэлефоне або вывучыць новую песню. Наогул, я вельмі таварыскі і ў мяне шмат сяброў. Калі мы гуляем, сумна не бывае».**

***— Хто з выканаўцаў табе падабаецца?***

— Джасцін Бібер і Джасцін Цімберлейк, а з расійскіх — Сяргей Лазараў.

***— Кім хочаш быць у будучыні?***

— Я заўсёды хацеў быць знакамітым, выступаць на сцэне, таму, што б ні здарылася, буду артыстам, мяне не палохае нават мутацыя голасу. Калі яна адбудзецца, усё роўна зноў навучуся спяваць і выканаю сваю мару стаць сапраўдным артыстам.

**Ангеліна НОВІКАВА, вучаніца 11 класа гімназіі №1 г. Дзяржынска.**

Музычны Алімп

# IOWA — рэкардсмен YouTube

**Кліп беларускага гурта IOWA на кампазіцыю «Б'е біт» сабраў больш за 50 мільёнаў праглядаў на YouTube. Гэта з'яўляецца рэкордам для беларускіх кліпаў.**

Відэаролік на песню «Б'е біт», які зняў рэжысёр Уладзімір Бяседзін, стаў самай «зорнай» работай гурта IOWA. Адзнаку ў 50 мільёнаў праглядаў кліпу ўдалося пераадолець менш чым за год — ён быў апублікаваны на YouTube 7 кастрычніка 2015 года.

Журналісты назвалі відэаролік «кліпам-мюзіклам». Салістка гурта IOWA Каця Іванчыкава так кажа пра відэаработу: «У кліпе шмат танцаў. Акрамя нас, у кадры ёсць яшчэ 14 танцораў. Угнацца за імі ў танцы было вельмі складана, але, здаецца, у нас гэта атрымалася».

На другім і трэцім радках у спісе ТОП-5 кліпаў беларускіх выканаўцаў на YouTube таксама работы IOWA: «Усміхайся» (звыш 24 мільёнаў праглядаў) і «Маршрутка» (каля 18 мільёнаў). На чацвёртым і пятым радках кліпы Макса Каржа: «У цемры» (каля 14 мільёнаў) і «Матылёк» (таксама каля 14 мільёнаў).



У лістападзе гурт IOWA выпусціць свой новы альбом «Import», а 30 кастрычніка выступіць у беларускай сталіцы з вялікім сольным канцэртам.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі газеты — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда», грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008.

Нумар падпісаны ў 19.30 05.10.2016 г.

На конкурс апавяданняў

**Імя Маргарыты Латышкевіч як маладой і перспектыўнай паэткі я ўпершыню пачуў, калі яна толькі пачала вучыцца на філфаку Белдзяржуніверсітэта. Пад канец вучобы ў Маргарыты ўжо сабралася вершаў на цэлы зборнік, які ў хуткім часе — у 2012 годзе — і выйшаў. Называўся ён «Пульс навальніц». Калі М. Латышкевіч стала магістранткай таго ж БДУ, я ўпершыню прачытаў яе апавяданні. Думаю, што і кнігу яе прозы мы неўзабаве ўбачым у кнігарнях, пра што ўскосна сведчыць і той факт, што аўтарка ўсё актыўней звяртаецца да больш буйнога празаічнага жанру — аповесці. Пасля заканчэння магістратуры Маргарыта стала аспіранткай свайго роднага ўніверсітэта і тут ужо гучна заявіла пра сябе як пра ўдумлівага літаратуразнаўцу, якому падуладныя і такія няпростыя, а калісьці і нязвыклыя для нашага прыгожага пісьменства тэмы: скажам, «Персанажны ход хранатопу сучаснага беларускага фэнтэзі».**

**Які жанр стане для Маргарыты Латышкевіч галоўным у пару яе творчай сталасці, загадваць пакуль рана, але і сёння ўжо можна сцвярджаць, што ў літаратуру яна прыйшла не выпадкова.**

**Алесь БАДАК.**

Маргарыта ЛАТЫШКЕВІЧ

# У.

КОЖНАЯ трынаццацігадовая дзяўчына мусіць быць закаханай. Гэта — аксіёма. Іначай няма пра што пашаптацца з сяброўкамі на перапынку, няма пра што перапісвацца з суседкай на ўроку геаграфіі. Няма прычыны, каб лішні раз падбегчы да велізарнага люстэрка ў жаночай прыбіральні, у якім усе твары становяцца падобнымі да агуркоў — выцягнутымі ды зялёнымі. Няма прычыны сумаваць за абедам і выпадкова выпіць чужы кампот. Адным словам, пакута — не жыццё.

Самае крыўднае было тое, што Лільчыны аднакласніцы даўно і трывала, нават звыкла захапляліся хлопцамі з адзінаццатага. І гаварылі пра іх бясконца, і хваліліся, і радасна павісквалі, расказваючы адна адной, як ледзь-ледзь не загаварылі, сутыкнуўшыся з аб'ектам свайго захаплення каля гардэроба. Сутыкаліся, між іншым, не сам-насам: па некаторых асабліва папулярных адзінаццацікласніках уздыхала адразу некалькі дзяўчатак, так бы мовіць, адзіным фронтам, за кампанію. Так што адважна кідаліся ў атаку ўсёй вісклівай купкай — і ледзь не збівалі аб'ект захаплення з ног. Аб'ект звычайна пакутліва чырванеў і сваруўся. Тады прыходзілі круглыя бабулькі-гардэробшчыцы і з лаянкай разганялі ўсіх:

— Вы тут яшчэ падушыцеся!

Захапляліся, варта сказаць, здаля. Калісьці куртуазныя рыцары абіралі сабе замужнюю даму сэрца і аддана служылі ёй, несучы любыя ініцыялы на шчыце. Так і тут: у большасці самых прыцягальных хлопцаў ужо былі каханыя дзяўчаты-аднагодкі. Апошнія ў асяроддзі раўнівых прыхільніц сваіх кавалераў спрэс мелі, як каралі дынастыі Каралінгаў, сталыя эпітэты поруч з імем: Дурніца Дана, Валасатая Віка, Парася Каця. Чалавеку неабазнанаму магло б нават падацца, што гэта — сапраўдныя прозвішчы.

ЛІЛІ і распавесці асабліва не было пра што. Да трынаццаці гадоў яна, вядома, дажыла не без сардэчных гісторый і рамантычных прыгод. Скажам, у дзіцячым садку ёй прызнаваўся ў каханні бляявы Мікітка, і гэта было б нават міла, каб Мікітка не бойся пры гэтым зялёненькім савочкам. Хтосьці з хлопчыкаў дарыў Лілі з нагоды розных свят самаробныя карткі, старанна склееныя іх мамкамі і бабулямі. Але ж гэта таксама лічыцца, праўда? Хтосьці дапамагаў намаляваць карабель ці данесці кніжкі да бібліятэкі. З кімсьці весела было вісноць на дрэве, гуляючы ў адважнага Робін Гуда, і майстраваць лукі. З кімсьці атрымлівалася толькі люта біцца, а паміж бойкамі, захоўваючы статус-кво, паказваць адно аднаму язык. Але ўсе гэтыя несумненныя знакі мужчынскай увагі — Ліля цудоўна разумела — зараз нікога ўразіць не маглі.

Так што на перапынку паміж матэматыкай і гісторыяй Валечка Сіўцова з таямнічым прыдыханнем расказвала пра сваю «даму сэрца» — найцудоўнага кучаравага Яўгена, які ўвечары звычайна шпацыраваў па плошчы Леніна з Дурніцай Данай. А Ліля сядзела побач і моўчкі дзьмулася. Вясёлай балбатлівай Валечцы яна сімпатызавала, і з той прычыны вельмі хацела гэтую ўтульную размову падтрымліваць. Але як? Не расказваць жа пра дурнога Мікіту і савочак. Глупства. А пра іншае, надзённае, блізкае расказваць не атрымлівалася. Вельмі проста.

З гісторыі Ліля ішла задуменная і трохі нават засмучоная. Думала са скрухай: вось, трынаццаць гадоў. Жыццё праходзіць, а што з таго? Прасцей было б, вядома, пайсці па шляху найменшага супраціўлення і таксама «ўтрэскацца» ў таго ж Яўгена. Вунь у Валечкі так прыгожа, так смачна гэта атрымліваецца, ажно зайздрасць бярэ.

А ў Лілі ўсё не так, як у людзей. Тое, што горача варочаецца ў сэрцы, і трымціць, быццам нацятая струна, і спявае, увасабляцца ў словах не жадае аніяк. Да горла нешта падступае, і вусны сціскаюцца, і чырвань залівае шчокі. Валечка вунь не чырванее і не маўчыць. Валечка шчабеча, быццам птушачка, ажно сэрца радуецца.

Да таго ж, аб'ект уздыхаў Лілі быў «непрэстыжным». Падумаеш, дзесяцікласнік. Хударлявы, сутулы, хадзіў у расцягнутым чорным світары, трос няструджанымі русымі валасамі. Нічога такога выключнага, гэта сама Лілька цудоўна разумела і праз гэта дадатково пакутавала. Добра каб спяваць умеў ці на гітары трэнькаць — ды не ж, талентаў не заўважана.

Але гарачыня ўспыхвала ўнутры маленькага Лільчынага сэрца, і разлівалася па ўсім целе, і засцілала вочы. Ад гэтага падкошваліся ногі і вусцішна займала дух. І недзе там, пад пакрывам гэтай усеабдымнай мляўкай гарачыні нараджаўся жах. Ледзьве не першабытны, беспрычынны, але тым больш моцны.

Заўважыўшы недзе на калідоры знаёмы чорны світар, Ліля стартавала на трэцяй касмічнай хуткасці. Не да аб'екта захаплення, як іншыя дзяўчаткі-аматаркі, а ад яго. Куды заўгодна, абы — ад.

Аднаго разу, сутыкнуўшыся са сваім аб'ектам на другім паверсе школы, Ліля вокамгненна рэціравалася да лесвіцы, узвілася на трэці паверх і, пэўна, палезла б на гарышча, калі б там не было замкнута. Згадзіцеся, як пра такое можна расказваць утульнай Валечцы Сіўцовай? Дзіка. Бязглузда. Сорам.

Так, у маленькай Лілі жыў горды дух, які ў сваёй слабасці прызнавацца не жадаў анікому, нават ласкавай птушачцы Сіўцовай. Гордасць, аднак, мае сваю цану, а таму гордыя сэрцы заўжды пакутуюць у самоце.

ТАК прамінуў цэлы год, і чарговым навальнічным маем, які поўніўся спакуслівым водарам бэзу, на чарговай выпускной лінейцы развіталася з былымі адзінаццацікласнікамі. Аматар расцягнутых світараў гэтым разам самому сабе здрадзіў: апрануўся ў строгі чорны касцюм, валасы падвязаў і нават расправіў плечы. Падносіў кветкі класнай Лільки і штосьці там гаварыў пра падзяку. Валечка Сіўцова пасмейвалася ды пхала безважную сяброўку локцем пад рэбры, а Ліля, грозна звёўшы бровы і падціснуўшы вусны, глядзела ўбок, на мокры ад навальнічнай залевы асфальт.



Яна і так выдатна ведала, дзе стаіць світараносец: адчувала скурай, як адчуваюць, заплюшчыўшы вочы, сонечныя промні.

— Глядзі, ну, глядзі ж ты, ну! — горача шаптала Валечка, апякаючы словамі Лільчына вуха.

Гордая Ліля, не жадаючы распісвацца ва ўласнай слабасці, не здавалася і не глядзела. Адчувала інстынктыўна, што нешта заканчваецца, што за ім непазбежна з'явіцца новае, выспее, забуяе. І гэтага новага — зноў жа, інстынктыўна — баялася.

І яшчэ болей баялася ад гэтага прадчування нечага новага, большага — зараўці, зарумзаць, быццам трохгадовая.

Не тут жа. Не пры ўсіх. І дакладна не пры кплівай Валечцы.

...НОВАЕ сапраўды прыйшло — новыя постаці, новыя ўсмешкі. Словы, вочы, рукі. Гарачыня находзіла хвалямі, але ўжо была звыклай, натуральнай. Не толькі не пужала — нават не здзіўляла.

Дарослая Ліля, праўда, на ўсё жыццё захавала прыхільнасць да хлопцаў з доўгімі валасамі ды ў расцягнутых світарах. Быццам драбочкі, аскепкі таго, першага (лепшага) цяпла яшчэ жылі ў сэрцы і час ад часу варушыліся ў ім, нагадвалі пра сябе.

А калі часам было кепска, Ліля ставіла ў імбрычку гарбату з бергамотам і за ёю згадвала. І валасы, і світар, і сутулыя плечы. Ад гэтага чамусьці заўсёды лепшала — і жыць хацелася, і любіць, і верыць.

Твар ягоны, праўда, зусім сцёрся з памяці.

■ Памяць

# Год без Алеся Савіцкага...

**Летась 6 кастрычніка перастала біцца сэрца вялікага Патрыёта, Грамадзяніна, палымянага Прамоўцы, Рамантыка Алеся Ануфрыевіча Савіцкага. Згарэў, як знічка, знянацку...**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

Асірацелі не толькі яго каханая жонка Людміла Барысаўна, дочкі Наталля і Таццяна з мужамі, унукі Яўген і Аляксандра з сем'ямі. Асірацела і наша сям'я, бо ён быў для нас добрым надзейным Сябрам, Настаўнікам, Дарадцам.

Асірацелі яго любімае Лысагор'е, родны Полацк, ды і ўся Беларусь...

Калі Алесь Ануфрыевіч заходзіў да нас на лецішча, то нават у пахмурны дзень святлела ўсё наўкола ад яго ўсмешак, аптымістычнага настрою, пазітыву, сярэбранай шавялюры. Заўсёды акуратны, стройны, як юнак, у арэале дарагога парфуму.

Колькі вогнішчаў мы распалілі ў доме творчасці «Іслач» і на яго любімым полі з магутнымі дубамі, седзячы на камяні, які дапамог дастаць з-пад зямлі Уладзімір Скарынкін! Камень гэты Алесь Ануфрыевіч называў «каменем працы і натхнення». Каля яго ён вырошчваў бульбу, кабачкі. Сеў адпачыць, любуючыся маляўнічымі краявідамі. Перапёлка падышла і загадала «шыцьпалоць». Я папрасіла: «Дай адпачыць чалавеку...»

Апошняе лета і восень Алесь Ануфрыевіч амаль штодня хадзіў на сваё поле з сякерай пад пахай, распальваў партызанскія вогнішчы перад захадам сонца, якое садзілася за зубчастыя дрэвамі. Аказалася, развітваўся, дзякаваў сонцу, як Хвядос са знакамітага фільма «Белыя росы», зняты па сцэнарыі яго земляка Аляксея Ануфрыевіча Дударава.

Часта мы з ім былі побач, слухалі ўспаміны, расказы. Здзіўляла яго бліскучая мова, неверагодная памяць у 91 год.

Апошняе эсэ пра любімае Лысагор'е Алесь Савіцкі надрукаваў у «Звяздзе» 29 жніўня 2015 года з цудоўным здымкам пад дубам-асілкам.

Пакуль мы жывыя, будзем падтрымліваць агонь тых вогнішчаў як памяць пра слаўтага сына, чалавека-творцу зямлі беларускай. А поле называем полем Савіцкага.

На жаль, развітанне з Алесем Ануфрыевічам прайшло не ў Мемарыяльнай зале Дома літаратара, дзе ён правёў столькі ўрокаў мужнасці з моладдзю, прывіваючы любоў да Бацькаўшчыны, зямлі беларускай.

Сяргей Грахоўскі расказваў, як аднойчы ў Ташкенце групу беларускіх пісьменнікаў сустракалі халаднавата каля трапа самалёта. Казалі: «Мы чакаем Савецкага». Ім адказалі, што мы ўсе «савецкія». Аказваецца, мелі на ўвазе Алеся Савіцкага!

Ён не здрадзіў сваім ідэалам, за якія змагаўся, будучы тры разы параненым. Ордэн Славы знайшоў яго праз 50 гадоў.

Дзякуем, Алесь Ануфрыевіч, што Вы былі ў нашым жыцці!

Спадзяёмся, што на доме №11 па вуліцы Янкі Купалы хутка з'явіцца мемарыяльная дошка, бо Алесь Савіцкі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, гэта заслужыў.

**Валянціна ЛУЦЭВІЧ-СКАРЫНКІНА.**

## ПА ДАРОЗЕ Ў ЗЯЛЁНАЕ

*Ідзём дарогай звілістай*
*Па лесе*
*На станцыю...*
*І правая рука*
*Пісьменніка*
*Савіцкага Алеся*
*Сціскае моцна лямку*
*рукзака.*

*Па гурбах снегу,*
*Верасе прымятым,*
*Па мокраму імшаніку*
*Праз лес*
*Хадзіў ён у юнацтве*
*З аўтаматам*
*Або з вінтоўкаю*
*наперавес.*

*Ля Полацка*
*Любая баравіна*
*Дагэтуль помніць*
*лёгкую хаду.*
*Дайшоў ён з аўтаматам*
*Да Берліна...*
*Я ўслед за ім*
*з павагаю іду.*

*Адважны вой*
*З блакітнымі вачамі*
*Зрабіў засад*
*І смелых рэйдаў шмат.*
*Здаецца,*
*І сягоння за плячамі*
*Вісіць не рэчмяшок,*
*А аўтамат.*

***Уладзімір СКАРЫНКІН***

РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

**«Статусныя падарункі ад А-100.2»** А-100

**Организатор рекламной игры:** Общество с дополнительной ответственностью «Астотрейдинг», 223053, Минская область, Минский район, д. Боровая, 7, УНП 690362737.

**Наименование рекламной игры:** «Статусныя падарункі ад А-100.2».

**Сроки проведения рекламной игры:** с 5 сентября по 14 октября 2016 года.

Правила рекламной игры зарегистрированы в Министерстве торговли 15 августа 2016 года, свидетельство №2809.

В рекламной игре принял участие 33 331 участник.

Призовой фонд разыгран полностью. Обладателями призов стало 130 человек.

Список победителей с информацией о выигрыше опубликован на официальном сайте сети АЗС «А-100» **www.azs.a-100.by**

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры + 375 17 233-33-33.

18 октября 2016 г. в 10.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Лорри-Сервис».

Повестка дня:

1. О величине уставного фонда и номинальной стоимости акций общества.
2. О внесении изменений в устав общества и утверждении устава в новой редакции.

Местонахождение ОАО «Лорри-Сервис»: г. Брест, ул. Дубровская, 36.
Место проведения собрания: г. Брест, ул. Дубровская, 36.
Время регистрации в день проведения собрания с 09.30 до 10.00.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни с 10.10.2016 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества. Совет директоров.

УНН 200246280

# Закрытое акционерное общество «Белорусско-Швейцарский банк «БСБ Банк»

**www.bsb.by**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 октября 2016 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 01.10.2016 г. | На 01.10.2015 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 24 610 | 23 125 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 14 345 | 3 776 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 14 152 | 27 482 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 59 763 | 56 467 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 84 034 | 30 999 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 3 713 | 4 463 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | 941 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 35 | 35 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 29 338 | 34 122 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | - | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | 9 | 152 |
| 13 | Прочие активы | 1112 | | 8 414 | 5 918 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | | 238 413 | 187 480 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | - | 7 328 |
| 17 | Средства банков | 1202 | | 3 062 | 81 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | | 178 458 | 123 818 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | - | - |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 14 | 1 446 |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | | 2 789 | 3 581 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 184 323 | 136 254 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | | 19 678 | 21 193 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 3 450 | 2 844 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 15 423 | 18 856 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | | 15 539 | 8 333 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 54 090 | 51 226 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 238 413 | 187 480 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 01 октября 2016 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 01.10.16 г. | На 01.10.15 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 6 423 | 6 233 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 1 830 | 1 888 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 4 593 | 4 345 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 14 746 | 13 564 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 3 205 | 2 032 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 11 541 | 11 532 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 983 | 1 211 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 350 | 460 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 12 518 | 16 197 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 986 | (142) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 3 395 | 5 873 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 1 699 | 949 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 15 927 | 14 151 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 884 | 478 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 12 464 | 14 050 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 2 159 | 2 816 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 10 305 | 11 234 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | | 1 | 1 |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | 1 | 1 |

**Руководитель** **Рябцев В.А.**

**Главный бухгалтер** **Авраменко Т.В.**

Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь № 7 от 27.09.2013. УНП 807000069.

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества** | **Лот № 1.** Погрузчик фронтальный с/х на базе Беларусь 82.1, модель МУП-351, 2012 года выпуска, местонахождение: Витебская область, Витебский район, д. Шапечино. Начальная стоимость лота – 15840,00 рубля. **Лот № 2.** Экскаватор-погрузчик, модель ДЭМ 1143, 2010 года выпуска, местонахождение: Витебская область, Витебский район, д. Старинцы. Начальная стоимость лота 17760,00 рублей. **Лот № 3.** Прицеп самосвальный тракторный, модель 2 ПТС-6, 2013 года выпуска, местонахождение: Витебская область, Витебский район, д. Шапечино. Начальная стоимость лота – 3496,00 рубля |
| **Собственник (владелец) имущества** | ОДО «Вереск» (г. Витебск, Мазуринский проезд, д. 3) |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Витебская область, Витебский район, д. Шапечино, д. Старинцы |
| **Наличие обременений** | В залоге в ЗАО «Идея Банк» |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения Витебского района г. Витебск, ул. Комсомольская, д. 31, каб. 14 **25 октября 2016 года в 10.00** |
| **Справочная информация** | Организатор торгов: ГУЮ Витоблисполкома, 210015, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, д. 10, к. 1 www.vitebskjust.gov.by, Судебный исполнитель Клименко Дмитрий Петрович, тел.: (80212) 23-64-15, 375 33 399-78-08 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Витебского района г. Витебска: филиал № 200 АСБ «Беларусбанк», код банка 150801635, р/с 3642903002661, УНП 300002505, **не позднее 20 октября 2016 года.** Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии с частью 6 статьи 516 Гражданского процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества |

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества** | **Лот № 1.** 1/2 доля в праве собственности на изолированное помещение – квартира с инвентарным номером 200/D-48666 площадью 44,9 кв.м (комната в 2-комнатной квартире). Начальная стоимость лота – 17500,00 рубля |
| **Собственник (владелец) имущества** | Яскевич Сергей Александрович |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | г. Витебск, ул. Герцена, 17-24 |
| **Наличие обременений** | Не имеется |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения Витебского района г. Витебск, ул. Комсомольская, д. 31, каб. 14 **18 октября 2016 года в 10.00** |
| **Справочная информация** | Организатор торгов: ГУЮ Витоблисполкома 210015, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, д. 10, к. 1 www.vitebskjust.gov.by, Судебный исполнитель Гребенчук Павел Владимирович, тел.: (80212) 33-64-62, 375 33 399-65-38 |
